ЗАЦВЕРДЖАНА
Загадам дырэктара дзяржаўнай
установы адукацыі
“Ударненская сярэдняя школа”
31.08.2024 № 177

# План работы

## Дзяржаўнай установы адукацыі «Ударненская сярэдняя школа» на 2024/2025 навучальны год

Разгледжана на педагагічным савеце
Пратакол 30.08.2024 № 9

ЗМЕСТ.

**Раздзел 1**. Аналіз вынікаў дзейнасці агульнаадукацыйнай установы за 2023/2024 навучальны год стар.3 - 30

**Раздзел 2.** Працэс кіравання ўстановай адукацыі стар.31- 56
2.1. Планаванне, арганізацыя дзейнасці ўстановы адукацыі
2.2. Планаванне самакантролю

**Раздзел 3**. Арганізацыйна-педагагічныя мерапрыемствы, накіраваныя на атрыманне вучнямі адукацыі стар.57 - 62

**Раздзел 4.** Ажыццяўленне адукацыйнага працэсу стар..62 - 68

**Раздзел 5**. Выхаваўчая і ідэалагічная работа стар..68 - 104

**Раздзел 6**. Работа з педагагічнымі кадрамі стар..105 - 110

**Раздзел 7.** Фінансава - гаспадарчая дзейнасць педагагічнага калектыву стар.111-112

## 1. Аналіз вынікаў дзейнасці дзяржаўнай установы адукацыі “Ударненская сярэдняя школа” за 2023/2024 навучальны год

Педагагічны калектыў дзяржаўнай установы адукацыі «Ударненская сярэдняя школа» на працягу 2023/2024 навучальнага года працаваў над праблемай

**“Удасканаленне сістэмы прафесійна-асобаснага росту педагогаў для забеспячэння эфектыўнасці адукацыйнага працэсу”**

У рабоце школа кіравалася Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і нарматыўна-прававымі дакументамі, рэкамендаванымі Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь для ўстаноў адукацыі ў 2023/2024 навучальным годзе.

Для вырашэння пастаўленых задач была арганізавана дзейнасць савета школы, педагагічнага савета, метадычных аб'яднанняў, сацыяльнай службы, ажыццяўляліся ўнутраны кантроль, вывучэнне запытаў вучняў і іх законных прадстаўнікоў, атэстацыя, павышэнне кваліфікацыі ў ГАІРА і АПА, работа з сям'ёй і пазашкольнымі арганізацыямі.

### 1.1.Аналіз выніковасці арганізацыйна-педагагічных мерапрыемстваў, накіраваных на атрыманне вучнямі адукацыі.

По стане на 31.05.2024 года ў школе навучалася 74 вучні: на 1 ступені агульнай сярэдняй адукацыі - 36, на 2 ступені – 28, на 3 ступені - 10. На 01.09.2023 было сфарміравана 11 класаў, 1 з якіх – першае аддзяленне дапаможнай школы. Напаўняльнасць класаў на першай ступені навучання складала 49% вучняў, на другой – 38%, на трэцяй – 13%. Колькасны састаў навучэнцаў за тры гады:

| Навучальны год | 2021/2022 | 2022/2023 | 2023/2024 |
|---|---|---|---|
| Колькасць вучняў | 65 | 70 | 74 |

Ўлік дзяцей школьнага ўзросту, якія пражываюць на замацаванай за школай тэрыторыі, ажыццяўляўся ў адпаведнасці з Палажэннем аб парадку арганізацыі ўліку дзяцей, якія падлягаюць навучанню на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджаным Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 08.11.2006 № 1493. У выніку скаардынаванай працы адміністрацыі, класных кіраўнікоў, педагога сацыяльнага у 2023/2024 навучальным годзе дзяцей школьнага ўзросту, якія не прыступілі да заняткаў, не было.

Адукацыйны працэс у 2023/2024 навучальным годзе быў арганізаваны ў адну змену ў рэжыме шасцідзённага школьнага тыдня, які ўключае пяцідзённы вучэбны тыдзень і адзін дзень для правядзення з навучэнцамі спартыўна-масавых, фізкультурна-аздараўленчых, выхаваўча-арганізацыйных мерапрыемстваў. Навучанне вучняў ажыццяўлялася па вучэбным плане, складзеным ў адпаведнасці з адзіным тыпавым вучэбным планам, па праграмах і вучэбна-метадычных комплексах, распрацаваных і зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Вучэбная нагрузка на аднаго вучня не перавышала ўстаноўленых нормаў. Наведванне вучнямі групы падоўжанага

дня, факультатыўных заняткаў, аб'яднанняў па інтарэсах было арганізавана на падставе заяў законных прадстаўнікоў вучняў.

На працягу навучальнага года ў школу прыбыла 2 вучні.

Штодня ажыццяўляўся кантроль за наведваннем навучэнцамі вучэбных заняткаў. Выпадкі пропускаў, сыходу з урокаў без уважлівай прычыны фіксаваліся настаўнікамі-прадметнікамі і дэталёва аналізаваліся педагогам сацыяльным сумесна з класнымі кіраўнікамі і членамі адміністрацыі. Па выніках аператыўна прымаліся неабходныя меры.

У 2023/2024 навучальным годзе ў школе працавала група падоўжанага дня, якую наведвалі 20 навучэнцаў 1-3 класаў. Рэжым работы групы падоўжанага дня быў абмеркаваны на педагагічным савеце, узгоднены з бацькоўскім камітэтам і зацверджаны дырэктарам школы. Для навучэнцаў шасцігадовага ўзросту, з улікам наяўных у школе ўмоў, быў арганізаваны дзённы сон, уведзена 3-х разавае харчаванне (падвячорак - за кошт бацькоўскіх сродкаў).

На пачатак навучальнага года ўсе навучэнцы былі забяспечаны падручнікамі, педагогі - метадычнымі дапаможнікамі і вучэбна-метадычнымі комплексамі.

Ва ўстанове адукацыі мэтанакіравана праводзілася работа па ахове здароўя і стварэнню бяспечных умоў жыццядзейнасці вучняў. Захаванню і ўмацаванню фізічнага здароўя садзейнічала наяўнасць спартыўнай залы, гульнявых пляцовак, футбольнага поля.

Медыцынскае абслугоўванне вучняў школы ажыццяўлялася фельдшарам меснага ФАПа. Фельдшар аказваў неабходную медыцынскую дапамогу, вёў маніторынг захворвання вучнямі педыкулезам і скуранымі захворваннямі, сумесна з класнымі кіраўнікамі вёў прафілактычную работу. Штогод праводзіцца абавязковы медыцынскі агляд вучняў працаўнікамі установы “Лельчыцкая цэнтральная раённая бальніца”. Заняткі па прадмету “Фізічная культура і здароўе” праводзіліся на падставе медыцынскіх даведак, згодна якім вучні былі размеркаваны па групах для заняткаў фізічнай культурай.

З мэтай прафілактыкі прастудных захворванняў рэгулярна праводзілася С-вітамінізацыі ежы ў сталовай. Для ўсіх вучняў установы арганізавана гарачае харчаванне. Дванаццаць вучняў з двух населеных пунктаў падвозіліся ў школу аўтобусам аддзела адукацыі, спорту і турызму Лельчыцкага райвыканкама.

Сіламі калектыву школы пры садзейнічанні бацькоўскага камітэту праводзілася пэўная работа па развіцці матэрыяльна-тэхнічнай і вучэбна-метадычнай базы вучэбных кабінетаў, спартыўнай залы, групы падоўжанага дня, пункта карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, прывядзенню іх у адпаведнасць з патрабаваннямі функцыянальнай прыдатнасці, эстэтычнаму афармленню. Адрамантаваны вучэбныя кабінеты. Разам з тым актуальнай застаецца праблема забяспечанасці неабходным вучэбным абсталяваннем, а таксама выкарыстання наяўнага абсталявання ў навучальным працэсе.

Цалкам рэалізаваны план пераемнасці з дзяржаўнай установай адукацыі "Ударненскі дзіцячы сад». З пачатку 2023/2024 навучальнага года для

выхаванцаў дзіцячага сада былў арганізаваны факультатыў на платнай аснове “Школа будучага першакласніка”.

Праводзілася работа па забеспячэнню аховы працы ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу.

У 2024/2025 навучальным годзе трэба:

1. Працягваць работу па ахове здароўя і стварэнню бяспечных умоў жыццядзейнасці вучняў

2. Развіваць вучэбна-метадычную і матэрыяльна-тэхнічную базу вучэбных кабінетаў.

**1.2.Аналіз выніковасці адукацыйнага працэсу.**

Вучэбныя дасягненні вучняў за 2023/2024 навучальны год педагагічны калектыў завяршыў з наступнымі паказчыкамі сваёй вучэбнай дзейнасці: сярэдні бал па школе склаў - 7,2.

Кантроль і ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў 1-2-га класаў ажыццяўляліся на змястоўнай аснове без выкарыстання адзнак. У адпаведнасці з інструктыўна-метадычным пісьмом «Аб арганізацыі работы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі па ажыццяўленню кантролю і ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў у перыяд безадзнакавага навучання на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі». Безадзнакавае навучанне ажыццяўлялася таксама ў 3-х-4-х класах па прадметах: выяўленчае мастацтва, фізічная культура і здароўе, музыка, працоўнае навучанне.

На вучэбных занятках выкарыстоўвалася шмат нагляднасці, раздатачнага матэрыялу; чаргаваліся розныя формы работы; праводзіліся фізкультхвілінкі, зарадка для вачэй; ўключаліся ў ўрок гульнявыя сітуацыі, шырока выкарыстоўваўся гульнявы матэрыял ( «рассыпаныя» словы, «ланцужкі» слоў, хуткамоўкі, «вясёлыя карцінкі», рэбусы, загадкі, крыжаванкі і інш.), накіраваныя на тое, каб зняць напружанне, пераключыць увагу дзяцей з аднаго навучальнага задання на іншае.

Настаўнікі 1, 2-га класаў Жогла З.У., Дашкевіч Ю.Ф. для адсочвання дынамікі паспяховасці кожнага вучня вялі рабочыя журналы, у якіх адбівалася ступень засваення таго ці іншага аспекту вучэбнай праграмы, сфарміраванасць уменняў і навыкаў; своечасова карэктавалі сваю працу, праводзілі розныя віды кантролю, аналізавалі поспехі і цяжкасці вучняў у засваенні ведаў.

У канцы навучальнага года былі праведзены кантрольныя работы па матэматыцы, беларускай мове з мэтай адсочвання выніковасці паспяховасці вучняў па лініі адміністрацыі. На аснове праведзенага кантрольнага спісвання можна адсачыць, што вучні 1-га класа ў асноўным засвоілі напісанне малых і вялікіх літар, іх злучэнні ў словах. Вынікі праверкі навыкаў чытання паказалі, што навучэнцы 1 класа авалодалі навыкамі літаратурнага чытання, засвоілі напісанне маленькіх і вялікіх літар, іх злучэнняў у словах. Навык асэнсаванасці чытання сфарміраваны амаль ва ўсіх навучэнцаў. 85% навучэнцаў чытаюць тэкст правільна, без скажэння слоў і замены літар, назіраецца выразнае чытанне ў 6 навучэнцаў. Навык чытання вучняў 1 класа склаў ад 28 слоў да 57 слоў. Кантрольная работа па матэматыцы паказала, што 80% вучняў умеюць запісваць лічбы ў парадку ўзрастання і ўбывання,

праводзіць разлікі на складанне і адыманне, параўноўваць лікі. 55% вучняў рашылі тэкставую задачу. Усе вучні 1 класа вучэбны матэрыял засвоілі ў на дастатковым узроўні.

Па выніках кантрольных работ па беларускай мове, праведзеных у 2 класе, можна сцвярджаць, што вучні справіліся з кантрольным дыктантам на сярэднім узроўні. 37 % з іх зрабілі памылкі на пропуск або замену літар, правапіс “ў “.

На дастатковым узроўні была выканана праверачная работа па матэматыцы ў 2 класе.

Вынікі вучэбнай дзейнасці вучняў 3, 4 класаў ацэньваліся па 10-бальнай сістэме. Атэставаны па выніках 2023/2024 навучальнага года 15 вучняў 3, 4 класаў. Па выніках года можна прасачыць наступныя вынікі:

| Клас | Прозвішча, імя, імя па бацьку настаўніка | Кол. вучняў | Паспяваюць | | | | | | | | | | Сярэдні бал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | на 9-10 | | на 7-8 | | на 5-6 | | на 3-4 | | на 1-2 | | |
| | | | Колькасц | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | |
| 3 | Кужалевіч Г.А. | 6 | - | - | 3 | 50 | 3 | 50 | - | - | - | - | 7,6 |
| 4 | Палын Н.А.. | 9 | - | - | 2 | 22 | 5 | 56 | 2 | 22 | - | - | 6,4 |

У асноўным закончылі вучэбны год на сярэднім і дастатковым узроўнях - 100% вучняў 3 класа (2022/2023 навучальны год – 87%), і 78% вучняў 4 класа (2022/2023 навучальны год- 67% ).

Пісьмовыя работы, праведзеныя па лініі адміністрацыі, паказалі, што настаўнікамі пачатковых класаў палепшылася работа па выпрацоўцы каліграфічных уменняў вучняў.

Паказчыкі вучэбнай дзейнасці вучняў 5-9,10-11 класаў:

Сярэдні бал – 7,6. Аналіз вучэбнай дзейнасці 5-9,10-11 класаў паказаў павелічэнне колькасці вучняў, якія займаюцца на сярэднім узроўні. Настаўнікам неабходна актывізаваць працу па фарміраванні матывацыйнай сферы вучняў, актывізацыі іх пазнавальнай дзейнасці з мэтай павышэння якасці ведаў. На працягу 2023/2024 навучальнага года настаўнікамі праводзілася пастаянная работа па кантролі стабільнасці і трываласці ведаў і ўменняў вучняў, аднак не ў час аказвалася дапамога навучэнцам пры засваенні праграмных тэм. Неабходна звярнуць увагу на нізкі вынік, які паказалі навучэнцы школы па вучэбных прадметах. І ў новым навучальным годзе варта больш увагі надаваць індывідуальнай рабоце з вучнямі, узмацніць кантроль за працай настаўнікаў, якія паказалі нізкі вынік. Аналіз стартавых пісьмовых работ, прамежкавых кантрольных работ, гадавых адзнак паказвае, што настаўнікі школы працуюць не ў поўнай меры па кантролі стабільнасці і трываласці ведаў вучняў.

Аналіз наведаных вучэбных заняткаў паказаў, што настаўнікі добра валодаюць праграмным матэрыялам і метадычна граматна яго выкладаюць. Ствараюць

неабходныя ўмовы для ўсебаковага развіцця вучняў, выкарыстоўваюць асобасна-арыентаваны падыход, парную, групавую, індывідуальную і франтальную формы работы.

Стабільную якасць ведаў вучняў і добры ўзровень правядзення ўрокаў забяспечваюць Баравая В.М., Жукавец М.А., Жогла З.У., Кужалевіч Г.А., Дашкевіч Ю.Ф., Коркуць С.Г. Большасць жа настаўнікаў працуюць не ў поўнай меры па забеспячэнні стабільнасці і трываласці ведаў вучняў.

Прычыны нестабільнасці паказчыкаў якасці адукацыі:

1) суадносіны дзейнасці настаўніка і вучня ў навучальным працэсе змяніліся і гэта патрабуе пошуку новай схемы ўзаемадзеяння настаўніка і вучня;

2) выкладанне часта інфармацыйнае, мала заданняў на творчую дзейнасць вучня;

3) няма сістэмы ў паўтарэнні вучэбнага матэрыялу;

4) на вучэбных занятках мала выкарыстоўваецца электронных сродкаў навучання, інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій.

5) не ўсе настаўнікі могуць цалкам пазбавіцца тлумачальна-ілюстраванага тыпу навучання.

**Задачы на 2024/2025 навучальны год:**

- кантраляваць стабільнасць і трываласць уменняў і навыкаў, своечасова аказваць дапамогу навучэнцам у засваенні праграмных тэм;

- актывізаваць працу па фарміраванні матывацыйнай сферы вучняў, актывізацыі іх пазнавальнай дзейнасці з мэтай павышэння якасці ведаў;

- выкарыстоўваць больш заданняў на творчую дзейнасць вучняў;

- актывізаваць работу па выкарыстанню электронных сродкаў навучання, інфамацыйна – камунікацыйных тэхналогій.

**Факультатыўныя заняткі.**

Прадоўжана работа па аптымізацыі сеткі факультатываў на ўсіх ступенях агульнай сярэдняй адукацыі ў адпаведнасці з запытамі навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў. У 2023/2024 навучальным годзе было арганізавана 19 факультатыўных заняткаў рознай накіраванасці: 10 - на першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі, 7 - на другой, 2 - на трэцяй. Пры размеркаванні гадзін факультатыўных заняткаў былі ўлічаны магчымасці кадравага забеспячэння ўстановы. Разнастайнасць факультатываў дазволіла задаволіць усе запыты навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў. Вынікі ўнутранага кантролю дазволілі зрабіць выснову, што педагогі добра знаёмыя з патрабаваннямі да правядзення факультатываў.

Разам з тым, у працэсе вывучэння ступені задаволенасці вучняў і іх законных прадстаўнікоў, якасцю гэтай працы былі пазначаныя наступныя праблемы:

- выбар тэм факультатыўных заняткаў не заўсёды адпавядае запытам вучняў;

- на факультатыўных занятках настаўнікі рэдка выкарыстоўваюць ЭСН.

**Задачы на 2024/2025 навучальны год:**

1. Працягнуць працу па аптымізацыі сеткі факультатыўных заняткаў на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі ў адпаведнасці з запытамі навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў.

2. Забяспечыць максімальную эфектыўнасць факультатыўных заняткаў пры дапамозе прадуктыўнага выкарыстання педагогамі магчымасцей камп'ютарнага класа, узаеманаведвання заняткаў і абмену вопытам, вывучэння перадавой педагагічнай практыкі ў рамках прадметных тыдняў.

**Платныя адукацыйныя паслугі.**

У 2023/2024 навучальным годзе ў школе працавалі факультатывы на платнай аснове: “Школа будучага першакласніка”, які наведвала 5 выхавальнікаў дзіцячага сада, “Англійская мова: крок за крокам”, які наведвала 12 вучняў.

**Задачы на 2024/2025 навучальны год:**

1. Пашырыць спектр платных адукацыйных паслуг на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі;

2. Шырэй рэкламаваць дадатковыя адукацыйныя магчымасці школы на бацькоўскіх сходах.

**Праца са здольнымі навучэнцамі.**

У 2023/2024 навучальным годзе педагогі школы працягвалі працу з адоранымі дзецьмі з мэтай стварэння ў школе ўмоў, якія забяспечваюць выяўленне, развіццё і падтрымку таленавітых навучэнцаў. Праца па развіцці інтэлектуальных здольнасцей навучэнцаў ажыццяўлялася праз прыцягненне іх да ўдзелу ў розных інтэлектуальных і творчых конкурсах, віктарынах, прадметных тыднях. У 2023/2024 навучальным годзе ў першым этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах ўдзел прынялі 17 вучняў, пераможцамі прызнаныя 9 вучняў. У другім этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах сярод вучняў 8,9,11 класаў ўдзел прынялі 5 вучняў. У 2022/2023 навучальным годзе дыпломаў заваёвана не было. У 2023/2024 навучальным годзе быў заваёваны дыплом III ступені па біялогіі.

У I этапе абласной алімпіяды сярод вучняў 4-9 класаў прыняла ўдзел 21 вучань, пераможцамі прызнаны 9 вучняў, якія прынялі ўдзел у другім этапе алімпіяды, але дыпломаў не атрымалі. У 2022/2023 навучальным годзе дыплом II ступені па біялогіі атрымала вучаніца 8 класа Флёрка Вікторыя (настаўнік Жукавец М.А.). Таксама вучні школы на працягу 2023/2024 навучальнага года актыўна ўдзельнічалі ў рэспубліканскіх конкурсах: «Журавлик» (14 вучняў) , «Кенгуру» (11 вучняў), «Лингвистёнок» (3 вучні), «Синица» (3 вучні), ”Инфомышка” (2 вучні), “Зубрёнок” (2 вучні), “Буслік” (12 вучняў).

Выснова: не ў поўнай меры праводзіцца праца настаўнікаў-прадметнікаў па выяўленню і развіццю творчых здольнасцей навучэнцаў пры падрыхтоўцы да рэспубліканскай і абласной алімпіяд.

**Задачы на 2024/2025 навучальны год:**

1. Працягнуць працу па павышэнні ўзроўню адукацыйнай падрыхтоўкі навучэнцаў з дапамогай удасканалення сістэмы правядзення факультатыўных, стымулюючых і падтрымліваючых заняткаў; развіцця груп з вывучэннем вучэбных прадметаў на павышаным узроўні; супрацоўніцтва з іншымі ўстановамі адукацыі ў пытаннях падрыхтоўкі вучняў да алімпіяднага руху, цэнтралізаванага тэсціравання і навукова-даследчай дзейнасці.

2.Прыняць меры, накіраваныя на павышэнне якасці адукацыйнага працэсу, з дапамогай актыўнага выкарыстання сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, сучаснага навучальнага і лабараторнага абсталявання.

3.Актывізаваць педагагічных работнікаў на здачу кваліфікацыйнага экзамену на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі.

4.Забяспечыць ўмовы для ранняга выяўлення здольнасцей навучэнцаў шляхам максімальнага прыцягнення іх да ўдзелу ў алімпіядах і інтэлектуальных конкурсах.

5.Працягнуць мэтанакіраваную працу па пераемнасці ў развіцці інтэлектуальных і творчых здольнасцей вучняў на I і II ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.

**Спецыяльная адукацыя.**

Арганізацыя інтэграванага навучання і выхавання дзяцей з асаблівасцямі псіха-фізічнага развіцця (далей - ОПФР) і карэкцыйна-развіваючая работа ў пункце карэкцыйна-педагагічнай дапамогі (далей - ПКПП) ажыццяўлялася ў адпаведнасці з нарматыўна-прававымі дакументамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. З улікам наяўнай матэрыяльна-тэхнічнай базы школы былі створаны аптымальныя ўмовы для навучання, выхавання, захавання і ўмацавання здароўя дзяцей з ОПФР.

Пры рэалізацыі карэкцыйна-развіваючай работы ў пункце карэкцыйна-педагагічнай дапамогі ў 2023/2024 навучальным годзе вырашаліся наступныя задачы:

1. Правядзенне паглыбленага абследавання дзяцей з ОПФР з мэтай вызначэння індывідуальна-тыпалагічных асаблівасцей і кірункаў карэкцыйнай работы.

2.Правядзенне карэкцыйна-развіваючай работы з дзецьмі з ОПФР, з улікам іх індывідуальных магчымасцей .

3. Вылучэнне функцыянальных зон у кабінеце пункта карэкцыйна-педагагічнай дапамогі.

4.Аказанне кансультатыўнай і метадычнай дапамогі суб'ектам адукацыйнага працэсу.

Работа ПКПП была арганізавана ў адпаведнасці з рэкамендацыямі інструктыўна-метадычнага пісьма «Аб арганізацыі карэкцыйна-педагагічнай дапамогі дзецям з асаблівасцямі псіха-фізічнага развіцця пры атрыманні імі дашкольнага або агульнай сярэдняй адукацыі ў 2023/2024 навучальным годзе" і іншымі нарматыўнымі дакументамі Міністэрства адукацыі. На падставе высноў Дзяржаўнай установы адукацыі «Лельчыцкі раённы ЦКРНіР», з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей дзяцей праводзіліся індывідуальныя заняткі з 2 вучнямі, складзены расклад. Індывідуальныя заняткі праводзіліся на аснове планавання, складзенага па выніках псіхолага-педагагічнага абследавання вучняў.

На працягу навучальнага года праводзілася актуалізацыя банка даных дзяцей з ОПФР, запаўняліся асабістыя карткі на зноў выяўленых навучэнцаў. На працягу года ў кабінеце праводзілася работа па стварэнні карэкцыйна-развіццёвага асяроддзя, папаўненню раздатачнага матэрыялу, вылучаны функцыянальныя зоны:

- вучэбная;

- гульнявая;
- зона сэнсарнага досведу;
- зона развіцця артыкуляцыйнай маторыкі.

У кабінеце аформлены стэнд «Гэта важна ведаць», вугалок дэфектолага для размяшчэння інфармацыі і рэкамендацый бацькам і педагогам установы.

На працягу навучальнага года ў рамках прафілактычнага і кансультатыўнага напрамку было праведзена 13 кансультацый:

- 7 індывідуальных для бацькоў і настаўнікаў;
- 6 індывідуальных для вучня па карэкцыі парушэнняў гукавымаўлення.

Для павышэння якасці аказання карэкцыйна-педагагічнай дапамогі ў 2024/2025 навучальным годзе неабходна працягнуць працу па папаўненні адукацыйнага асяроддзя кабінета, удасканальваць работу па развіцці звязнай мовы дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту, выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі, у тым ліку ІКТ для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў .

**Вынікі выпускных экзаменаў.**

Да экзаменаў за перыяд навучання на ўзроўні агульнай базавай адукацыі было дапушчана 5 вучняў.

***Вынікі экзаменаў за перыяд навучання***
***на ІІ-й ступені агульнай базавай адукацыі***

| № п/п | Прадмет | Агульная кол. вуч. | Коль-ка-ць вуч. здаўшых экз. | Вынікі экзаменаў. Гадавыя адзнакі. | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | НСІЭ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Высокі узровень | | | | Дастатковы узровень | | | | Сярэдні узровень | | | | Здавальняючы узровень | | | | Нізкі узровень | | | | |
| | | | | Экз. | | Год | | Экз. | | Год | | Экз. | | Год | | Экз. | | Год | | Экз. | | Год | | |
| | | | | К-ць | % | К-ць | % | К-ць | % | К-ць | % | К-ць | % | К-ць | % | К-ць | % | К-ць | % | К-ць | % | К-ць | % | |
| 1 | Бел. мова. | 6 | 6 | 2 | 33 | 1 | 17 | 1 | 17 | 2 | 33 | 1 | 17 | 0 | 0 | 2 | 33 | 3 | 50 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| 2 | Руск. мова | 6 | 6 | 1 | 17 | 0 | 0 | 2 | 33 | 2 | 33 | 1 | 17 | 1 | 17 | 2 | 33 | 3 | 50 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| 3 | Матэ-матыка | 6 | 6 | 0 | 0 | 0 | 0 | 2 | 33 | 2 | 33 | 2 | 33 | 1 | 17 | 2 | 33 | 3 | 50 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| 4 | Гіст. Бел. | 6 | 6 | 1 | 17 | 3 | 50 | 2 | 33 | 1 | 17 | 3 | 50 | 1 | 17 | 0 | 0 | 1 | 17 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| | Усяго | 24 | 24 | 4 | 17 | 4 | 17 | 7 | 29 | 7 | 29 | 7 | 29 | 3 | 13 | 6 | 25 | 10 | 42 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |

Выпускныя экзамены на высокім узроўні здалі 17%, дастатковым узроўні 29%, сярэднім узроўні 29%, на здавальняючым – 25%., нізкім 0%.Сярэдні бал атэстатаў склаў – 6,8 балаў.

***Вынікі цэнтралізаваных экзаменаў за перыяд навучання***

***на III-й ступені агульнай сярэдняй адукацыі***

| № п/п | Прадмет | Агульная кол. вуч. | Коль ка-ць вуч. здаўшых экз. | Вынікі экзаменаў. Гадавыя адзнакі. | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | НСІЭ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Высокі узровень | | | | Дастатковы узровень | | | | Сярэдні узровень | | | | Здавальняючы узровень | | | | Нізкі узровень | | | | |
| | | | | Экз. | | Год | | Экз. | | Год | | Экз. | | Год | | Экз. | | Год | | Экз. | | Год | | |
| | | | | К-ць | % | К-ць | % | К-ць | % | К-ць | % | К-ць | % | К-ць | % | К-ць | % | К-ць | % | *К-ць* | % | К-ць | % | |
| 1 | Бел. мова. | 2 | 2 | 0 | 0 | 1 | 8 | 1 | 7 | 0 | 0 | 0 | 0 | 1 | 8 | 1 | 8 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | - |
| 2 | Руск. мова | 5 | 5 | 3 | 21 | 1 | 8 | 2 | 14 | 3 | 21 | 0 | 0 | 1 | 8 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | - |
| 3 | Біялогія | 4 | 4 | 2 | 14 | 1 | 8 | 1 | 7 | 1 | 7 | 1 | 8 | 2 | 14 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | - |
| 4 | Матэматыка | 3 | 3 | 1 | 7 | 1 | 8 | 2 | 14 | 2 | 14 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | - |
| | Усяго | 14 | 14 | 6 | 42 | 4 | 32 | 6 | 42 | 6 | 42 | 1 | 8 | 4 | 30 | 1 | 8 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |

Выпускныя экзамены на высокім узроўні здалі 42% вучняў, дастатковым узроўні 32%, сярэднім узроўні 42%, на здавальняючым – 30%., нізкім 8%.

У асноўным вынікі выпускных экзаменаў сведчаць аб аб'ектыўнасці ацэначнай дзейнасці педагогаў, добрай арганізацыі работы па паўтарэнню і сістэматызацыі вучэбнага матэрыялу пры падрыхтоўцы да іспытаў.

Разам з тым у школе няма ні аднаго вучня, які атрымаў пасведчанне з адзнакай.

З мэтай павышэння якасці ведаў вучняў і падрыхтоўкі іх да цэнтралізаванага тэсціравання настаўнікамі праводзіліся дадатковыя заняткі з вучнямі 11 класа. Таксама былі арганізаваны факультатыўныя заняткі па матэматыцы.

71% вучняў 11 класа удзельнічалі ў цэнтралізаваным тэсціраванні.

***Вынікі цэнтралізаванага тэсціравання вучняў 11 класа***

| № | Прадмет | Колькасць вучняў, якія здавалі ЦТ | Набраны бал |
|---|---|---|---|
| 1 | Фізіка | 3 | 39/60/71 (56,6%) |
| 2 | Гісторыя Беларусі | 2 | 47/45 (46%) |

Сярэдні бал ЦТ па школе ў 2023/2024 навучальным годзе склаў 52,4%

Вучні 4-10 класаў прымалі актыўны ўдзел у дзвух этапах дыягнастычнага тэсціравання.

Два вучні 9 класа і тры вучні 10 класа працягнуць навучанне ў данай установе адукацыі для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі.

**Задачы на 2024/2025 навучальны год:**

1.Павышаць узровень падрыхтоўкі вучняў да выпускных экзаменаў праз правядзенне рэзультатыўных вучэбных, факультатыўных, стымулюючых і падтрымліваючых заняткаў.

2. Працягваць сістэматычную мэтанакіраваную работу педагагічнага калектыву па падрыхтоўцы вучняў да здачы цэнтралізаванага тэсціравання.

3. Працягваць матываваць вучняў 9 класаў на працягванне навучання ва ўстановах, што забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

**1.3. Стан здароўя і фізічнага развіцця вучняў**

Аналіз узроўню здароўя і здаровага ладу жыцця вучняў школы праводзіцца па выніках медыцынскіх аглядаў, назіранняў класных кіраўнікоў, настаўнікаў фізічнай культуры.

Клопат пра здароўе дзяцей стаіць на першым плане. Умовы, стымулюючыя павышэнне ўзроўня самаадчування і здароўя вучняў у рэжыме дня – гэта добразычлівая атмасфера ў класным, школьным калектывах, сістэма фізкультурна – аздараўленчых мерапрыемстваў, рухомыя перамены, фізкультпаўзы на працягу урока, урокі фізічнай культуры, пазакласная работа па аздараўленню: спартыўныя секцыі, спаборніцтвы, спартыўныя святы, Дні здароўя, фізічнае выхаванне ў рэжыме групы падоўжанага дня.

На працягу года вялася работа з бацькамі па захаванню адзіных патрабаванняў да рэжыму дня, прапагандзе здаровага ладу жыцця, арганізацыі рацыянальнага харчавання дзяцей, прывучэнне дзяцей да самаабслугоўвання, захаванне санітарна-гігіенічнага рэжыму, рацыянальная арганізацыя працы і адпачынку, барацьба са шкоднымі звычкамі, гігіенічнае выхаванне.

Аналіз здароўя вучняў паказаў, што за 2023/2024 навучальны год узровень захворванняў знізіўся, знізіўся ўзровень часта хварэючых вучняў ВРЗ, хранічнымі захворваннямі.

**1.4.Аналіз работы з педагагічнымі кадрамі .**

Важную ролю ў якасным ажыццяўленні адукацыйнага працэсу займае кадравае забеспячэнне. У 2023/2024 навучальным годзе адукацыйны працэс забяспечвала 22 педагога. З іх з вышэйшай адукацыяй - 21 педагог - 95%. Па выніках атэстацыі вышэйшую і першую кваліфікацыйную катэгорыю маюць 15 педагогаў (68%), другую кваліфікацыйную катэгорыю маюць 3 педагога, не маюць катэгорыі - 4 педагога (18%). Стаж педагагічнай дзейнасці да пяці гадоў маюць сем педагогаў, ад пяці да дзесяці – тры, ад дзесяці да дваццаці – чатыры, ад дваццаці аднаго года і вышэй – восем педагогаў.

Аналіз кадравага складу сведчыць аб тым, што большасць настаўнікаў маюць дастатковы вопыт і кваліфікацыю для ажыццяўлення якаснага адукацыйнага працэсу.

У калектыве створана атмасфера супрацоўніцтва паміж маладымі настаўнікамі і педагогамі сярэдняга і старэйшага ўзросту.

Асновай выніковай работы ўстановы па павышэнню ўзроўню прафесійных кампетэнцый педагагічных кадраў з'яўляецца сістэма метадычнай работы. У 2023/2024 навучальным годзе былі арганізаваны:

- работа метадычных аб'яднанняў настаўнікаў-прадметнікаў;
- індывідуальная работа па тэмах самаадукацыі;
-павышэнне кваліфікацыі ў Акадэміі паслядыпломнай адукацыі і Гомельскім абласным інстытуце развіцця адукацыі .

У школе была арганізавана работа 4 метадычных аб'яднанняў: МА настаўнікаў прадметаў гуманітарнага цыклу – кіраўнік Наскевіч С.Л., МА настаўнікаў прадметаў прыродазнаўча-матэматычнай накіраванасці - кіраўнік Флёрка І.В., МА настаўнікаў пачатковых класаў і выхаваценя ГПД – кіраўнік Жогла З.У.; МА класных кіраўнікоў - кіраўнік Баравая В.М. Названыя метадычныя аб’яднанні вялі мэтанакіраваную дзейнасць па развіцці светапогляду, прафесійна-каштоўнасных і асобасна-маральных якасцяў педагагічных работнікаў праз ўсебаковае павышэнне кваліфікацыі і ўдасканаленне педагагічнага майстэрства, па фарміраванні актыўнай грамадзянскай пазіцыі ва ўсіх удзельнікаў педагагічнага працэсу, па развіцці творчага патэнцыялу педагогаў, выяўленню і абагульненню перадавога педагагічнага вопыту.

У 2023/2024 навучальным годзе на пасяджэннях МА разглядаліся пытанні як тэарэтычнага, так і практычнага характару. Аднак неабходна павысіць якасць працы кіраўнікоў метадычных аб'яднанняў. У 2024/2025 навучальным годзе трэба больш увагі звяртаць на крытычны падыход пры складанні дадзенага лакальнага дакумента, адзначаць шляхі  выхаду на існуючыя праблемы ў дзейнасці МА.

Важная роля ў сістэме работы у рабоце з кадрамі належыць павышэнню кваліфікацыі педагогаў на базе дзяржаўнай установы адукацыі “Гомельскі абласны істытут развіцця адукацыі”, дзяржаўнай установы адукацыі “Акадэмія паслядыпломнай адукцыі”. Ва ўстанове адукацыі распрацаваны перспектыўны план павышэння кваліфікацыі педагогаў, які выконваецца ў поўным аб’ёме.

Адной з найважнейшых умоў, якія забяспечваюць павышэнне якасці адукацыі навучэнцаў, з'яўляецца прафесійны рост настаўнікаў. У 2024/2025 навучальным годзе патрэбна больш увагі звярнуць на падрыхтоўку настаўнікаў да здачы кваліфікацыйнага экзамену на прысваенне вышэйшай катэгорыі.

За мінулы навучальны год 4 педагогі школы былі слухачамі курсаў павышэння кваліфікацыі ў ГАІРА.

Павышэнню ўзроўню прафесійнага майстэрства спрыяла панарама адкрытых урокаў, правядзенне адкрытых урокаў і мерапрыемстваў у рамках прадметных тыдняў, падрыхтоўкі да педагагічнага савета. Адміністрацыя школы пастаянна праводзіла знаёмства калектыва з інавацыйнымі працэсамі, якія адбываюцца ў рэспубліцы і за мяжой. З гэтай мэтай рыхтаваліся выставы навінак метадычнай літаратуры. Аднак варта адзначыць, што не на належным узроўні яшчэ знаходзіцца вывучэнне, абагульненне педагагічнага вопыту настаўнікаў школы, прапаганда яго ідэй. Настаўнікі не імкнуцца дзяліцца сваім вопытам праз сродкі масавай інфармацыі.

Разам з наяўнымі станоўчымі вынікамі ў рабоце педагагічнага калектыву маюцца і праблемы:

– праца са слабапаспяваючымі і адоранымі дзецьмі;

– забеспячэнне вучэбных кабінетаў навучнымі дапаможнікамі;

– выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій.

Метадычная работа ў школе ў новым навучальным годзе будзе накіравана на:

- адсочванне працы па назапашванню і абагульненню вопыту;

- стварэнне адукацыйнага асяроддзя для раскрыцця прафесійнага і творчага патэнцыялу педагогаў;

- станаўленне прафесійнага майстэрства педагогаў.

**Задачы на 2024/2025 навучальны год:**

1.Працягнуць працу над агульнакультурнай і псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкай;

2.Арганізаваць навукова-даследчую працу па розных прадметах;

3.Прапагандаваць вопыт настаўнікаў-прадметнікаў праз арганізацыю адкытых урокаў;

4.Працягнуць працу над павышэннем якасці адукацыі праз развіццё інфармацыйнай культуры педагагічнага калектыву ўстановы;

5.Арганізаваць прадметныя тыдні на больш высокім узроўні.

6.Матывацыю настаўнікаў на праходжанне атэстацыі на вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю.

7. Адсочванне працы па назапашванні і абагульненню вопыту.

8. Стварэнне адукацыйнага асяроддзя для раскрыцця прафесійнага і творчага патэнцыялу педагогаў.

**1.5. Аналіз работы сацыяльнай службы за 2023/2024 навучальны год.**

Работа педагога сацыяльнага ў 2023/2024 годзе праводзілася ў адпаведнасці з планам, зацверджаным на пачатак года дырэктарам школы. Работа планамерна праводзілася з усімі катэгорыямі статусных сем'яў і навучэнцаў школы. У ходзе вывучэння і аналізу асяроддзя складзены сацыяльны пашпарт ўстановы адукацыі, які выглядаў наступным чынам:

- пражываюць у шматдзетных сем'ях 29 вучняў (14 сямей);

- пражываюць у малазабяспечаных сем'ях - 4 вучні (2 сям'і);

-пражываюць у няпоўных сем'ях - 3 вучні (3 сям'і) ;

- прыёмных дзяцей – 8 вучняў (6 сямей);

-вучні, якія стаяць на ІПР – 1;

- знаходзілася ў сацыяльна небяспечным становішчы – 3 вучні;

- патрабуюць да сябе павышанай увагі – 1;

- апекунская сям'я – 2 вучні (1 сям'я)

На працягу навучальнага года класнымі кіраўнікамі і педагогам сацыяльным ажыццяўляўся перыядычны патранаж сем'яў - прыёмных, мнагадзетных, няпоўных, сем'яў, чые дзеці знаходзяцца ў сацыяльна - небяспечным становішчы. У рамках рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №18 працягвалася работа па выяўленні і абароне дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна - небяспечным становішчы, прафілактыцы сямейнага недабрабыту, педагагічнаму ўздзеянню на бацькоў, якія не належным чынам выхоўваюць дзяцей.

Педагогам сацыяльным наладжана супрацоўніцтва з рознымі дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі:

– Лельчыцкі РАУС, ІСН;

– КДН Лельчыцкага райвыканкама, аддзел адукацыі, спорту і турызму, Лельчыцкі СПЦ;

– УАЗ «Лельчыцкая ЦРБ";

–тэрытарыяльны цэнтр абслугоўвання і занятасці насельніцтва, упраўленне па працы і занятасці насельніцтва.

З пералічанымі арганізацыямі вядзецца сумесная работа па прафілактыцы сямейнага недабрабыту, папярэджанні фізічнага і псіхічнага гвалту над дзецьмі, выяўленне прычын няшчасця і праца над ліквідацыяй гэтых прычын.

У 2023/2024 навучальным годзе педагогам сацыяльным з навучэнцамі школы праводзіліся разнастайныя выхаваўча-прафілактычныя мерапрыемствы, а менавіта:

- удзел у рэйдах «Падлетак», «Сям'я без гвалту», «Назіральная камісія»;

-індывідуальная і групавая работа па прафілактыцы негатыўных тэндэнцый у паводзінах навучэнцаў, якія патрабуюць павышанага педагагічнага кантролю, было арганізавана кансультаванне бацькоў.

- арганізацыя пазаўрочнай занятасці навучэнцаў: спартыўныя секцыі і аб'яднанні па інтарэсах «Лагарытміка», «Кулявая стральба», «Эрудыт», «Столяр-канструктар», “Цудоўныя клубочкі”;

- сустрэчы, гутаркі і кансультацыі навучэнцаў з інспектарам ІСН, РАНС, АСВОД, медыцынскай службы.

Навучэнец Пчалінцаў Кірыл, з якім праводзіцца індывідуальна-прафілактычная работа, прымаў ўдзел у арганізацыі і правядзенні агульнашкольных свят, спартыўных мерапрыемстваў, былі арганізаваны экскурсіі ў Лельчыцкі краязнаўчы музей, абласны ліцэй МНС. Адміністрацыя школы цесна ўзаемадзейнічае з суб'ектамі прафілактыкі. Сумесна з інспектарамі ІСН, інспектарамі ДАІ, супрацоўнікамі АСВОД былі праведзены прафілактычныя лекцыі, гутаркі для вучняў 1-8, 9-11 класаў. Усе лекцыі і гутаркі ўлічваюцца педагогам сацыяльным ў часопісе ўліку прафілактычных гутарак. Аформлены стэнд «Закон і падлетак». Па папярэджанні правапарушэнняў на працягу навучальнага года праводзіліся:

- класныя гадзіны, хвіліны зносін па прафілактыцы ўжывання шкодных рэчываў, па ПДР;

- гутаркі і практычныя заняткі па прафарыентацыі;

- тыдні па прафілактыцы паводзін на дарогах, ужыванню наркотыкаў, курэнню, па палавому выхаванню.

- арганізацыя аздараўлення непаўналетніх.

На працягу 2023/2024 навучальнага года праводзіўся штодзённы кантроль наведвання вучняў, высвятляліся прычыны іх адсутнасці або спазненняў, падтрымлівалася цесная сувязь з бацькамі і класнымі кіраўнікамі. У выпадку працяглай адсутнасці вучня сацыяльны педагог і класныя кіраўнікі высвятлялі прычыну адсутнасці вучня ў школе. Асаблівая ўвага была ўдзелена занятасці

навучэнцаў, якія патрабуюць павышанага нагляду, асабліва у канікулярны перыяд. У чэрвені наведвалі школьны аздараўленчы лагер 15 вучняў: 4 вучняў з мнагадзетных сямей, 1 вучань з прыёмнай сям'і, 1 вучань з апекунскай сям'і, 2 вучні СНС, 1 вучань, з якім праводзіцца ІПР.

Вышэй пералічаныя мерапрыемствы былі накіраваны на фарміраванне ў навучэнцаў навыкаў бяспечных і адказных паводзін, здаровага ладу жыцця, прафілактыку супрацьпраўных дзеянняў навучэнцаў. У мэтах прафілактыкі дэвіянтных паводзін навучэнцаў, злачынстваў і правапарушэнняў штомесяц праводзіліся пасяджэнні савета прафілактыкі з удзелам бацькоў, інпектараў ІСН. На пасяджэннях разглядаліся пытанні ў дачыненні да непаўналетніх, схільных да дэвіянтных паводзін, і ў дачыненні да бацькоў, якія не выконваюць належным чынам бацькоўскіх абавязкаў, аб прыняцці мер адміністрацыйнага ўздзеяння да бацькоў, якія ўхіляюцца ад выхавання дзяцей.

Нягледзячы на праводзімую работу, захоўваюцца «цяжкія» падлеткі.

У наступным навучальным годзе плануецца працягваць працу па выяўленні:

сацыяльных і асобасных праблем навучэнцаў;

сацыяльна - педагагічнай ахове правоў дзяцей;

забеспячэнні сацыяльна - педагагічнай падтрымцы сям'і, фарміраванні асобы вучня;

сацыяльна - педагагічнай прафілактыкі.

Аналізуючы работу педагога сацыяльнага за 2023/2024 навучальны год, можна выявіць шэраг праблем, якія ўзнікаюць у працэсе работы:

1.Праблемы, звязаныя з неадэкватным і дэвіянтнымі паводзінамі, дэзадаптацыі дзяцей і падлеткаў у сацыяльным асяроддзі;

2.Праблемы, звязаныя з нядобранадзейнасцю сям'і;

3.Праблемы, звязаныя з канфліктамі і маральна-псіхалагічным кліматам у сям'і;

4.Праблемы, звязаныя з захаваннем псіхічнага здароўя дзяцей, развіццём асобы, самавызначэннем дзяцей і падлеткаў;

5.Праблемы маральнага становішча бацькоў, безнагляднасць, алкагалізм і, як следства, педагагічная занядбанасць дзяцей, педагагічная непісьменнасць бацькоў, іх негатоўнасць або нежаданне займацца выхаваннем дзяцей.

**Задачы 2024/2025 навучальны год:**

1.Фарміраванне ў вучняў адэкватнага ўяўлення пра здаровы лад жыцця, прафілактыка стамляльнасці школьнікаў у працэсе вучэбнай работы.

2.Каардынацыя дзейнасці ўсіх спецыялістаў школы па павышэнню якасці адукацыі і сацыяльнай адаптацыі дзяцей і падлеткаў.

3.Сацыяльная абарона дзяцей, якія знаходзяцца пад апекай.

4.Фарміраванне ў старшакласнікаў матывацыі і пазнавальных інтарэсаў да працягу адукацыі.

5.Прафілактыка правапарушэнняў сярод падлеткаў.

6.Арганізацыя мэтавага вольнага часу навучэнцаў.

**1.6. Аналіз рэзультатыўнасці выхаваўчай і ідэалагічнай работы**

Арганізацыя выхаваўчай і ідэалагічнай работы школы ў 2023/2024 навучальным годзе ажыццяўлялася ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Праграмай бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёйскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь на 2021-2025 гады, іншымі нарматыўнымі прававымі дакументамі і інфармацыйна-метадычнымі матэрыяламі па актуальных напрамках арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы.

Мэтай выхаваўчай работы ў 2023/2024 навучальным годзе з'яўлялася стварэнне ўмоў для фарміравання featureнабакова развітай, маральна сталай, творчай асобы навучэнца, выхаванне гатоўнасці да ўдзелу ў эканамічнай, сацыяльнай, культурнай і палітычнай сферах жыцця, здольнасці быць суб’ектам грамадскіх зносін.

Задачы выхаваўчай работы:

-узмацніць работу па выхаванню грамадзянскасці, патрыятызму, духоўнасці, фарміраванню ў дзяцей маральнай і прававой культуры.

- актывізаваць работу па ўдзелу дзяцей у конкурсах, фестывалях, аглядах рознага ўзроўню.

- павысіць эфектыўнасць работы па прафілактыцы асацыяльных паводзін сярод непаўналетніх праз удасканаленне сістэмы аказання сацыяльна-псіхалагічнай і педагагічнай дапамогі навучэнцам і іх бацькам.

- развіваць сістэму дадатковай адукацыі з улікам запытаў навучэнцаў і іх бацькоў, хутка і аператыўна рэагаваць на змяненне інтарэсаў навучэнцаў праз адкрыццё запатрабаваных заняткаў па інтарэсах.

- узмацніць ролю сям'і ў выхаванні дзяцей і прыцягненне бацькоў да арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу.

- стварыць ўмовы для захавання і ўмацавання здароўя навучэнцаў.

Прыярытэтнымі накірункамі ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў школе былі: грамадзянска-патрыятычнае выхаванне; фарміраванне духоўна-маральных каштоўнасцей; здаровы лад жыцця і прафілактыка злачынстваў і правапарушэнняў; прафесійная арыентацыя; арганізацыя 6-га дня тыдня, прававое выхаванне, узаемадзеянне школы і сям’і.

На працягу года праводзіўся бягучы і выніковы кантроль за арганізацыяй выхаваўчай работы. Пытанні разглядаліся на педсавеце, нарадзе пры адміністрацыі. У адпаведнасці з нарматыўнымі дакументамі ў школе аформлены стэнды: «Школьнае жыццё», «Інфармацыя», «ГА БРПА», «ГА БРСМ», «Адно акно», «Падлетак і закон», “Выратавальнік пажарны”, «Шосты дзень», «Выконваем правілы дарог», «Сімволіка Рэспублікі Беларусь”, “Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Лельчыцкага раёна і Рэспублікі Беларусь”

У мэтах павышэння якасці ідэалагічнага суправаджэння адукацыйнага працэсу на працягу года арганізоўвалася ўзаемадзеянне з бацькамі з дапамогай школьнага сайта. На сайце школы, на інфармацыйных стэндах размешчана інфармацыя аб тэлефонах даверу, па якім можна атрымаць экстранную псіхалагічную дапамогу. На сайце размяшчалася і рэгулярна абнаўлялася

інфармацыя аб мерапрыемствах якія праводзіліся ў школе, аб дасягненнях навучэнцаў, фотасправаздачы, інфармацыя для выпускнікоў і іх бацькоў прафарыентацыйнага характару. На старонцы «Карысная інфармацыя» размяшчалася інфармацыя аб згубным уздзеянні курыльных сумесяў на арганізм чалавека, аб адказнасці за захоўванне і збыт наркатычных рэчываў, памяткі аб правілах бяспечных паводзін дзяцей ў час канікул, у складаных умовах надвор'я, рэкамендацыі для бацькоў вучняў.

У новым навучальным годзе неабходна працягваць работу па папулярызацыі школьнага інтэрнэт-сайту сярод навучэнцаў, бацькоў, педагогаў.

З мэтай павышэння метадычнай граматнасці педагогаў школы па пытаннях арганізацыі выхаваўчай і ідэалагічнай работы ва ўстанове адукацыі функцыянавала метадычнае аб'яднанне класных кіраўнікоў.

План работы аб'яднання выкананы ў поўным аб'ёме. На пасяджэннях разглядаліся пытанні пошуку найбольш эфектыўных форм і метадаў арганізацыі выхаваўчай работы з класным калектывам, вывучаліся нарматыўныя прававыя дакументы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, адпрацоўваліся навыкі арганізацыі мерапрыемстваў з навучэнцамі і іх законнымі прадстаўнікамі. Быў зроблены акцэнт на сумеснай працы класнага кіраўніка і бацькоў у вырашэнні пытанняў выхавання школьнікаў. Класныя кіраўнікі дзяліліся думкамі, назапашаным вопытам, навінкамі ў разнастайных формах і метадах выхаваўчай работы. Было праведзена адкрытае пасяджэнне па пытанні "Прафілактыка выкарыстання наркатычных рэчываў, метадычныя парады па арганізацыі работы з законнымі прадстаўнікамі вучняў". Штомесяц класныя кіраўнікі праводзілі заняткі, сходы з бацькамі навучэнцаў у рамках праекта "Бацькоўскі універсітэт". На працягу года праводзіліся адкрытыя мерапрыемствы па грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню навучэнцаў, здароваму ладу жыцця, вырашэнню канфліктных сітуацый. На пасяджэнні метадычнага аб'яднання праходзіўся аналіз мерапрыемстваў і абмен вопытам работы ў дадзеным накірунку.

Рэалізацыя выхаваўчых задач ажыццяўлялася праз арганізацыю раённых і агульнашкольных мерапрыемстваў, работу аб'яднанняў па інтарэсах, дзяжурства па школе, працоўную дзейнасць, правядзенне традыцыйных школьных мерапрыемстваў, спартыўных спаборніцтваў, працу вучнёўскага самакіравання, сувязь з установамі дадатковай адукацыі: ЦКД, СДЮШАР, школа мастацтваў.

Як і ў мінулым годзе да ўсіх мерапрыемстваў, якія праводзіліся ў школе, класныя кіраўнікі падыходзілі творча, імкнучыся выкарыстоўваць розныя формы. Арганізуючы пазакласныя мерапрыемствы, класныя гадзіны класныя кіраўнікі выкарыстоўвалі прэзентацыі, відэаролікі, якія дазвалялі маляўніча і наглядна прадставіць любы матэрыял, а таксама дазвалялі эканоміць час падрыхтоўкі і правядзення мерапрыемства. Многія класныя гадзіны вызначаліся неардынарнасцю, цікавым падыходам у прадастаўленні матэрыялу.

Праблемы:

- Застаецца праблема з наладжваннем вучнёўскага самакіравання ў класах, класныя кіраўнікі імкнуцца ўсю ролю арганізацыі мерапрыемстваў узяць на сябе.

- Класныя кіраўнікі не ў поўнай меры вялі работу па арганізацыі сустрэч з цікавымі людзьмі, арганізацый экскурсій, паходаў. Прычынай з'яўляецца як матэрыяльнае становішча сем'яў навучэнцаў, так і нежаданне класных кіраўнікоў займацца арганізацыйнымі пытаннямі, звязанымі з паездкамі.
Шляхі вырашэння:
- Арганізацыя работы па актывізацыі самастойнага ўдзелу класных калектываў у паўсядзённым жыцці класа, школы.
- Актывізацыя работы з сям'ёй па арганізацыі вольнага часу навучэнцаў, забеспячэнні іх занятасці ў шосты дзень, арганізацыі экскурсій.

Прыярытэтным накірункам у выхаваўчай рабоце з'яўляецца грамадзянска-патрыятычнае выхаванне, асноўнай мэтай якога з'яўляецца вызначэнне гатоўнасці асобы да годнага служэння Айчыне, фарміраванне прафесійна-значных якасцяў, уменняў і гатоўнасці да іх актыўнай праявы ў розных сферах жыцця грамадства, усведамленне значнасці нацыянальнай прыналежнасці.

Выхаванне грамадзяніна і патрыёта ажыццяўлялася праз рэалізацыю выхаваўчай функцыі ўрокаў гуманітарнага цыклу, ідэалагічнае суправаджэнне адукацыі, арганізацыю класных і інфармацыйных гадзін. Навучэнцы прымалі актыўны ўдзел у конкурсах, якія праводзіліся ў рамках рэспубліканскай акцыі “Жыву ў Беларусі і тым ганаруся”, у месячніку абаронна-патрыятычнай і спартыўнай работы “Эстафета патрыятычных спраў”, у тыднях прававых ведаў, што спрыяла павышэнню грамадзянскай актыўнасці навучэнцаў, фарміравала палітычную культуру.

Найбольш значнымі формамі работы былі:
- акцыя «Памяць» – ўборка магілак, тэрыторыі каля абеліскаў і помнікаў на тэрыторыі Ударненскага сельскага Савета;
- акцыя «Віншавальная паштоўка» (віншаванне з Днём пажылых людзей вязня Вялікай Айчыннай вайны, настаўнікаў-ветэранаў педагагічнай працы);
- акцыя «Клопат» (валанцёрская работа па аказанні дапамогі адзінокім жыхарам вёскі, вязню Вялікай Айчыннай вайны);
- акцыя «Калядны падарунак» (дапамога дзецям - інвалідам);
- мітынг да 9 Мая;
-тыдзень “Хатынская трагедыя”
-тыдзень памяці “Моладзь памятае”, прысвечаны ахвярам Вялікай Айчыннай вайны.
- тэматычныя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню яднання беларускага народа, Дню маці, тыдню бацькоўскай любві, Дню бацькі, Дню Перамогі, Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, Дню Настаўніка, 23 лютага, 8 Сакавіка, Дню яднання народаў Беларусі і Расіі, 37-ай гадаўшчыне катастррофы на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, Дню сям’і ў рамках рэспубліканскай акцыі “Мая сям’я – мая краіна”, Дню усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны – 82-ай гадаўшчыне пачатку ВА вайны;
- тыдзень, прысвечаны Дню абаронцаў Айчыны, у ходзе якога прайшлі гульні-спаборніцтвы "А ну-ка, хлопцы", выпуск віншавальных лісткоў да Дня абаронцы

Айчыны, урокі Мужнасці, прысвечаныя героям Вялікай Айчыннай вайны і воінам –інтэрнацыяналістам;
- працоўныя аперацыі «Сагрэем вашы сэрцы», «SOS! Смецце», «Усё для вёскі, каб стала прыгажэй» і г. д.;
- патрыятычная дэкада, прымеркаваная да святкавання 79-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне;
- валанцёрская работа, якая ажыццяўлялася атрадамі «Забота" і "Міласэрнасць». За навучэнцамі школы былі замацаваны чатыры адзінокія грамадзяне, якія пражываюць на тэрыторыі Ударненскага сельскага Савета. Работа атрадаў накіравана на аказанне рэальнай практычнай дапамогі пажылым людзям ва ўборцы тэрыторыі, нарыхтоўцы дроў і інш.

Праблемы:

Недастаткова актывізавана работа па ўдзелу вучняў у праектах, конкурсах грамадзянска – патрыятычнай накіраванасці.

Шлях вырашэння:

Фарміраванне сістэмы работы па прыцягненню вучняў да пошукавай даследчай дзейнасці.

З мэтай удасканалення сістэмы духоўна-маральнага выхавання навучэнцаў актывізавана супрацоўніцтва з настаяцелем Ударненскага храма "Васкрэсеннне Хрыстова" Мікалаем праз правядзенне сумесных мерапрыемстваў: лекцый, гутарак, круглых сталоў, экскурсій.

Праблемы:

Недастатковая арганізацыя сумесных сустрэч настаяцеля Ударненскага храма з бацькамі навучэнцаў, якія патрабуюць павышанага кантролю.

Шляхі вырашэння:

-з мэтай удасканалення сістэмы духоўна-маральнага выхавання навучэнцаў арганізаваць цыкл класных гадзін з запрашэннем настаяцеля Ударненскага храма.

- удасканальваць сістэму работы па духоўна-маральнаму выхаванню з бацькамі.

- актывізаваць работу па ўдзелу вучняў у конкурсах, эстафетах, спаборніцтвах патрыятычнай накіраванасці.

Дадатковая адукацыя ў школе накіравана забяспечыць максімальную рэалізацыю індывідуальных здольнасцей, творчых патрэб і інтарэсаў вучняў. У 2023/2024 навучальным годзе працавалі аб'яднанні па інтарэсах: «Цудоўныя клубочкі», «Столяр-канструктар», "Эрудыт", «Кулявая стральба», «Лагарытміка"; секцыі па валейболу, настольнаму тэнісу, шашкам і шахматам. На працягу навучальнага года ажыццяўляўся маніторынг занятасці вучняў у шосты дзень тыдня, улік занятасці вучняў, якія патрабуюць павышанага кантролю.

Занятасць навучэнцаў у аб'яднаннях па інтарэсах

| Год | Ко-ць гурткоў | У іх вучняў / % ахопу | Ко-ць секцый | У іх вучняў / % ахопу |
|---|---|---|---|---|

| | | (з разліку 1 вучань -1 від занятасці) | | (з разліку 1 вучань -1 від занятасці) |
|---|---|---|---|---|
| 2021/2022 | 7 | 65/95% | 2 | 24/36% |
| 2022/2023 | 5 | 60/87% | 3 | 36/56% |
| 2023/2024 | 5 | 68/90% | 3 | 36/49% |

Асаблівай папулярнасцю карысталіся аб'яднанні па інтарэсах “Кулявая стральба”, “Цудоўныя клубочкі», “Сталяр-канструктар” іх наведвальнасць складала 80%. Найбольшая наведвальнасць аб'яднанняў у зімовы час. Вясной і восенню, калі можна даўжэй пагуляць на стадыёне, спартыўнай пляцоўцы, вучні неахвотна наведваюць аб’яднанні.

У 2023/2024 навучальным годзе павысілася рэзультатыўнасць ўдзелу вучняў у рэспубліканскіх, абласных і раённых конкурсах:
"Экспанат для музея" Бахвалава Вольга, дыплом III ступені; раённы этап рэспубліканскага конкурса “ТехноЁлка”, Янкавец Яна, дыплом I ступені, раённы этап рэспубліканскага інтэрнэт-конкурса “Здабыткі гісторыі: асобы і падзеі” у рамках праекта “Cskript.Art.by”, Янкавец Яна, дыплом III ступені, раённы этап рэспубліканскага конкурса па інтэр’ернаму дызайну і фларыстыцы “Зялёны дом”, Янкавец Аліна, дыплом II ступені, раённы этап рэспубліканскага конкурса “Квітней, мой лес!” і вучнёўскай навукова-практычнай канферэнцыі, Бахвалав Вольга, дыплом I ступені, раённы турнір па інтэлектуальным гульням сярод школьнікаў “Гомельская завіруха 2023”, Машчыц Раман, Ярмоленка Сяргей, Дашкевіч Крысціна, Дзенісовіч Дар’я, Янкавец Аліна, Грэчанюк Вікторыя, Салаўёва Ульяна, дыплом II ступені, раённы этап творчага конкурса для дзяцей і падлеткаў “Соблюдаем законы дорог!”, Янкавец Аліна, дыплом I ступені, раённы этап рэспубліканскага конкурса навуковых даследчых краязнаўчых работ навучэнцаў, дыплом III ступені, раённы этап абласнога конкурса “Театральный перекрёсток”, калектыў “Сябры”, адзначаны за актыўны ўдзел, раённы конкурс мультымедыйных прэзентацый “Когда мы едины – мы непобедимы!”, Янкавец Алеся Леанідаўна, настаўнік абслуговай працы, дыплом III ступені, раённы этап Рэспубліканскай благачыннай акцыі “Чудеса на Рождество”, піянерская дружына імя Зоі Касмадзям’янскай, дыплом II ступені.

Аналіз занятасці навучэнцаў дазваляе зрабіць наступныя вывады:
- падтрымліваюцца стабільныя паказчыкі занятасці вучняў у аб'яднаннях па інтарэсах.
- навучэнцы, якія патрабуюць павышанай педагагічнай увагі, былі на 100% занятыя ў аб'яднаннях па інтарэсах.
- Павысіўся ўдзел навучэнцаў у конкурсах рознага ўзроўню.

Спартыўна – аздараўленчая дзейнасць школы ажыццяўлялася па трох накірунках: пазакласная работа, правядзенне фізкультурна-масавых і спартыўных мерапрыемстваў, маніторынг фізічнага развіцця.

У пачатку навучальнага года было распрацавана і зацверджана палажэнне аб круглагадовай спартакіядзе на навучальны год і складзены каляндар масавых

спартыўных мерапрыемстваў. Спаборніцтвы планаваліся раўнамерна на працягу навучальнага года і праводзіліся ў розных формах. На працягу года школьныя каманды выязджалі на раённыя спаборніцтвы ў рамках Спартакіяды сельскіх школьнікаў. Арганізавана работа спартыўнай зала ў вячэрні час.
Праблемы:
- аслаблена работа бацькамі вучняў, па прыцягненню іх да ўдзелу ў спартыўных мерапрыемствах.
Шляхі вырашэння:
- ахоп 100% занятасцю спортам навучэнцаў школы.
- прыцягненне бацькоў да ўдзелу ў спартыўных мерапрыемствах.
- актывізаваць работу па выяўленню найбольш падрыхтаваных вучняў для удзелу у спартыўных спаборніцтвах.

Ва ўстанове адукацыі створаны ўмовы для арганізацыі вольнага часу навучэнцаў, у тым ліку ў шосты школьны дзень. У шосты школьны дзень школа будуе сваю працу па прынцыпе стварэння спрыяльных умоў для самаразвіцця кожнага навучэнца. Кожная субота мела свой прыярытэтны накірунак (Дзень прафілактыкі шкодных звычак, Дзень здаровага харчавання ў школе, Дзень дзіцячых і моладзевых грамадскіх арганізацый, Дзень спорту і турызму і інш.)

Кожную другую суботу месяца праводзіліся Дні здароўя, традыцыйнымі сталі святы «Мама, тата, я – спартыўная сям'я», «Вас выклікае спартландыя» і інш. Рэгулярна праводзіліся сацыяльна значныя акцыі, працавалі валанцёрскія атрады. Забяспечана правядзенне тэматычных дыскатэк не менш чым 1 раз у месяц. Рэгулярна абнаўляўся інфармацыйны стэнд «Што рыхтуе нам субота», інфармацыя аб мерапрыемствах шостага школьнага дня размяшчалася на сайце школы, што забяспечвала своечасовае інфармаванне навучэнцаў і бацькоў. У суботу працаваў камп'ютарны кабінет. Сярэдні ахоп у 6-ы школьны дзень за 2023/2024 навучальны год склаў 80 %.
Праблемы:
- Недастаткова наладжана сістэма ўзаемадзеяння з прадпрыемствамі і арганізацыямі раёна па пытаннях прафарыентацыі дзяцей у вольны час.
Шляхі вырашэння:
- актывізаваць работу аб'яднанняў па інтарэсах у суботні дзень на 100%;
- наладзіць работу па супрацоўніцтву з прадпрыемствамі і арганізацыямі раёна па пытаннях прафарыентацыі дзяцей у вольны час.

Адным з важных напрамкаў работы педагагічнага калектыву з'яўлялася прафарыентацыйная работа, якая ажыццяўлялася з улікам запытаў сучаснага рынку працы, запатрабаванасці прафесій, патрэбаў выпускніка. З мэтай прыцягнення бацькоў да рашэння пытанняў далейшага прафесійнага самавызначэння выпускнікоў забяспечана актуалізацыя пытанняў прафарыентацыі на агульнашкольных бацькоўскіх сходах для бацькоў вучняў 9, 11 класаў, былі арганізаваны ярмаркі вакансій з удзелам прадстаўнікоў розных прафесій. Класнымі кіраўнікамі, педагогам сацыяльным праводзілася дыягностыка прафесійных намераў, матываў выбару прафесіі, карэкцыя арыентацыі на ўзровень адукацыі і спосабы яго атрымання, а таксама

дыягностыка якасцяў, неабходных для асваення абранай прафесіі (тэставанне). І як аб'ектыўны вынік усе вучні выпускных класаў робяць свой выбар свядома і абгрунтавана, які арыентаваны на атрыманне адукацыі і прафесіі ва ўласных інтарэсах з улікам перспектыў самарэалізацыі ў сваім рэгіёне.

Работа па прафілактыцы дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму ажыццяўлялася праз:

-цыкл пазакласных мерапрыемстваў па папярэджанню дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму;

- разгляд дадзенага пытання ў рамках курсу АБЖ;

-размяшчэнне актуальнай інфармацыі на інфармацыйных стэндах, на сайце школы;

-правядзенне рэйдаў - праверак па наяўнасці флікераў;

-абмеркаванне пытанняў бяспекі дарожнага руху на бацькоўскіх сходах;

-сустрэчы з работнікамі ДАІ.

**Задачы на 2024/2025 навучальны год:**

- Сістэматызаваць работу педагагічнага калектыву ў дадзеным накірунку;
- працягваць практычныя семінары для навучэнцаў праз узаемадзеянне з ДАІ.

На працягу года ў школе вялася работа па выхаванню грамадзяніна і патрыёта праз арганізацыю педагагічнай падтрымкі дзейнасці дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў. У 2023/2024 навучальным годзе сваю дзейнасць ажыццяўлялі наступныя дзіцячыя і моладзевыя арганізацыі:

Грамадская арганізацыя «Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя». Спісачны склад яе складае 21 піянер.

Грамадская арганізацыя «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» налічвае 20 членаў. З іх 16 вучняў (80%), 4 - працуючая моладзь (20%).

Другасная занятасць моладзі з'яўляецца адным з найбольш запатрабаваных і прыярытэтных напрамкаў работы ГА «БРСМ». Валанцёрская дзейнасць - гэта адно з галоўных напрамкаў дзейнасці ГА «БРПА» і ГА «БРСМ». Актывісты пярвічных арганізацый рэгулярна становяцца актыўнымі ўдзельнікамі дабрачынных акцый. Немалаважная роля адводзіцца культурна-масавай працы. У школе арганізуюцца танцавальныя вечары, віктарыны, гульнёвыя праграмы. Пры правядзенні дыскатэк праводзяцца тэматычныя праграмы: «Здаровы лад жыцця і прафілактыка Сніду», «Жыццё без наркотыкаў», «Юмарына», «Добрае сэрца», «Усе фарбы жыцця для цябе».

Работа ў органах вучнёўскага самакіравання садзейнічае станаўленню асобы дзіцяці, фарміруе актыўную грамадзянскую пазіцыю і самасвядомасць грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Вучнёўскае самакіраванне ўстановы, савет старшакласнікаў прымае самы актыўны ўдзел у паўсядзённым жыцці, на паседжаннях савета ўстановы сумесна з настаўнікамі разглядаюцца прапановы па добраўпарадкаванню тэрыторыі, па арганізацыі правядзення акцый, месячнікаў, тыдняў. Вучоба піянерскага актыву праходзіць раз у тыдзень. Праходзяць зборы піянерскай дружыны, сходы пярвічнай арганізацыі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Яны спрыяюць фарміраванню

сацыяльна-адказнага грамадзяніна сваёй Айчыны, які гатовы прымаць асабісты ўдзел у вырашэнні праблем сённяшняга грамадства.
Праблемы:
- некаторыя класныя кіраўнікі адчувалі цяжкасці ў распрацоўцы аптымальнай мадэлі самакіравання ў класе.
Шляхі вырашэння:
- працягнуць работу па арганізацыі і падтрымцы дзіцячага самакіравання, больш актыўнага прыцягнення дзяцей да грамадскага жыцця класа і школы;
- класным кіраўнікам выкарыстоўваць рознаўзроўневы падыход у арганізацыі самакіравання з улікам асабістых патрэб навучэнцаў, якія вызначаюць іх мэты;
- педагагічнаму калектыву весці работу па выяўленню навучэнцаў з арганізатарскімі здольнасцямі.

**Задачы на 2024/2025 навучальны год:**

- прадоўжыць работу па выхаванню грамадзянскасці, патрыятызму, духоўнасці, фарміраванню ў дзяцей маральнай і прававой культуры;
- узмацніць эфектыўнасць работы па прафілактыцы асацыяльных паводзін сярод непаўналетніх праз удасканаленне сістэмы аказання сацыяльна-псіхалагічнай і педагагічнай дапамогі навучэнцам і іх бацькам;
- развіваць сістэму дадатковай адукацыі з улікам запытаў навучэнцаў і іх бацькоў, хутка і аператыўна рэагаваць на змяненне інтарэсаў навучэнцаў праз адкрыццё запатрабаваных заняткаў па інтарэсах;
- узмацніць ролю сям'і ў выхаванні дзяцей і прыцягненне бацькоў да арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу;
- стварыць ўмовы для захавання і ўмацавання здароўя навучэнцаў;
- прадоўжыць работу па актывізацыіі ўдзелу дзяцей у конкурсах, фестывалях рознага ўзроўню.

### 1.6. Аналіз выніковасці кіраўніцкай дзейнасці

Кіраўніцтва адукацыйным працэсам ажыццяўлялася ў адпаведнасці з Кодэксам РБ аб адукацыі, Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, Палажэннем аб савеце ўстановы адукацыі, Статутам школы і іншымі нарматыўна-прававымі дакументамі. Быў сфармаваны і функцыянаваў асноўны орган самакіравання – Савет школы. На працягу навучальнага года ім разглядаліся найбольш актуальныя для ўстановы пытанні:
- Аб арганізацыі школьнага харчавання. Санітарны стан абедзеннай залы і харчаблока.
- Сістэма кіравання аховай працы ўстановы адукацыі. Захаванне санітарна-гігіенічных нормаў і правілаў у школе.
- Сістэма работы школы ў 6-ы школьны дзень.
-Фізкультурна-аздараўленчая і спартыўна-масавая работа ў сістэме адукацыйнага працэсу школы і іншыя.

Кіраўніцкія функцыі таксама выконваў педагагічны савет. На працягу 2023/2024 навучальнага года было праведзена 8 пасяджэнняў педагагічнага савета, на якіх разглядаліся пытанні па арганізацыі адукацыйнага працэсу, вынікі франтальнага кантролю за станам выкладання і якасцю ведаў вучняў па

грамадазнаўству, нямецкай мове, аб арганізацыі вольнага часу і змястоўным напаўненні шостага школьнага дня, выніки работы школы па выкананні Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі беларусь ад 24 лістапада 2004 года №18 "Аб дзяржаўнай абароне дзяцей у сацыяльна-небяспечных сем'ях".
Пры правядзенні педсаветаў выкарыстоўваліся актыўныя формы работы, якія спрыялі актыўнаму ўдзелу кожнага педагога ў прыняцці рашэнняў.

Актуальныя пытанні павышэння эфектыўнасці навучальных і факультатыўных заняткаў, падрыхтоўкі вучняў да прадметных алімпіяд, выпускных экзаменаў, цэнтралізаваных экзаменаў і цэнтралізаванага тэсціравання разглядаліся на нарадах пры дырэктару, намесніку дырэктара па вучэбнай рабоце.

Адна з асноўных кіраўніцкіх функцый у арганізацыі эфектыўнага адукацыйнага працэсу рэалізоўвалася кіраўнічымі структурамі праз выкананне плана ўнутранага кантролю, які быў складзены на аснове аналізу работы школы за папярэдні год.

Унутраны кантроль ахопліваў асноўныя аспекты работы школы і дазваляў атрымліваць інфармацыю для далейшага прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў.

Кантроль праводзіўся галосна, яго вынікі даводзіліся да ведама членаў педагагічнага калектыву. Па выніках кантролю адміністрацыя рыхтавала аналітычныя матэрыялы і праекты кіраўніцкіх рашэнняў, ажыццяўляла карэкцыю адукацыйнага працэсу. Выніковыя матэрыялы кантролю разглядаліся на нарадах пры дырэктару, намесніках дырэктара, метадычных аб'яднаннях. Па выніках унутранага кантролю, а таксама па запытах педагогаў адміністрацыя аказвала адрасную метадычную дапамогу.

На працягу навучальнага года былі рэалізаваны ўсе раздзелы плана ўнутранага кантролю. Аднак разам са станоўчымі вынікамі кіраўніцкай дзейнасці варта адзначыць і праблемныя напрамкі, праца па якіх у 2024/2025 навучальным годзе запатрабуе асаблівай увагі, дадатковых намаганняў, удасканалення дзейнасці, а такім чынам і іншых кіраўнічых рашэнняў:

1.Забеспячэнне шматузроўневай сістэмы ўнутранага кантролю, якая дазваляе ўключыць у дадзены працэс адміністрацыю, кіраўнікоў метадычных аб'яднанняў, настаўнікаў з вышэйшай катэгорыяй.

2. Распрацоўка сістэмы кантролю за выкананнем рашэнняў, што прымаюцца, правядзеннем пры неабходнасці паўторнага кантролю.

**Задачы на 2024/2025 навучальны год:**

1. Забяспечваць адпаведнасць ўнутранага кіравання і кантролю Кодэксу Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, лакальным нарматыўным прававым актам школы.

2. Ствараць умовы для выканання Праграмы развіцця і гадавога плана работы школы, плана мерапрыемстваў па выніках праверкі вывучэння стану кіраўніцкай дзейнасці і арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстанове.

3. Удасканальваць сістэму ўнутранага кантролю праз рацыянальнае размеркаванне адпаведных абавязкаў паміж суб'ектамі кіруючай падсістэмы,

распрацоўку і ўкараненне сістэмы кантролю за выкананнем прынятых рашэнняў.

4. Развіваць інфармацыйна-камунікацыйную адукацыйную прастору праз удасканаленне кіраўніцкай кампетэнцыі адміністрацыі ўстановы, забеспячэнне эфектыўнага кіравання установай.

**1.7. Аналіз выніковасці работы з сям'ёй, грамадскасцю і соцыумам.**

Без супрацоўніцтва з бацькамі школа не зможа вырашаць задачы выхавання падрастаючага пакалення. Асноўныя напрамкі, па якіх школа будавала свае адносіны з бацькамі наступныя:

- вывучэнне выхаваўчых магчымасцей сем'яў і педагагічная карэкцыя адносін паміж дзецьмі і дарослымі;
- прыцягненне бацькоў да кіравання школай;
- уцягванне бацькоў у адукацыйны працэс;
- псіхолага-педагагічная асвета бацькоў.

Прыцягненне бацькоў да кіравання школай рэалізоўвалася праз работу бацькоўскага камітэта школы і бацькоўскіх камітэтаў класаў, удзел бацькоў у пазакласных мерапрыемствах, савеце ўстановы адукацыі па прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх, рабоце настаўніцка - бацькоўскага патруля.

На працягу года на агульнашкольным бацькоўскім сходзе разглядаліся такія пытанні, як: неастаўленне дзяцей без нагляду, арганізацыя харчавання ў школе; занятасць навучэнцаў у канікулярны перыяд; работа па прафілактыцы шкодных звычак; падрыхтоўка і правядзенне атэстацыі, правядзенні ўрачыстых лінеек і выпускнога вечара.

На працягу года працаваў тэлефон даверу. За кансультацыяй звярталіся бацькі па пытаннях ацэньвання ведаў навучэнцаў, узаемаадносін «настаўнік-вучань», адказнасці непаўналетніх за правапарушэнне. На сайце школы створана старонка для бацькоў.

На працягу 2023/2024 навучальнага года ўстанова адукацыі актыўна супрацоўнічала з КСУП «Ударны», ЦКіД.

Праблемы:

- Не ў поўным аб'ёме класныя кіраўнікі праводзяць мерапрыемствы з бацькамі ў рамках класа, якія накіраваны на занятасць дзяцей у вольны час, на наладжванне дзіцяча-бацькоўскіх адносін;
- Не для ўсіх класных кіраўнікоў бацькоўскі сход з'яўляўся школай асветы бацькоў, часцей за ўсё на бацькоўскіх сходах аналізаваліся вучэбныя дасягненні навучэнцаў, характарызаваліся іх магчымасці.

**Задачы на 2024/2025 навучальны год:**

- Класным кіраўнікам неабходна ўлічваць больш шырокі спектр пытанняў, якія закранаюць розныя аспекты інтэлектуальнага, духоўна-маральнага і фізічнага развіцця дзяцей для дасягнення галоўнай мэты бацькоўскіх сходаў — сумесна з бацькамі знайсці рашэнні праблем, якія ўзнікаюць у выхаванні і навучанні дзяцей;

- Прыцягненне бацькоў да больш актыўнага ўдзелу ў жыцці школы і прымяненне актыўных форм, прыёмаў і метадаў работы з бацькоўскай грамадскасцю;
- Правядзенне тэматычных агульнашкольных бацькоўскіх сходаў з прыцягненнем спецыялістаў, медыцынскіх работнікаў, работнікаў РАУС і інш.

**1.8. Аналіз выніковасці фінансава-гаспадарчай дзейнасці ўстановы адукацыі**

На працягу 2023/2024 навучальнага года прымаліся пэўныя меры па забеспячэнню захаванасці будынка школы, мэблі, прыцягненню пазабюджэтных сродкаў для ўмацавання і развіцця матэрыяльна-тэхнічнай і вучэбнай базы школы, стымулявання працы педагогаў.

Сіламі калектыву школы пры садзейнічанні бацькоўскага камітэту праводзілася пэўная работа па развіцці матэрыяльна-тэхнічнай і вучэбна-метадычнай базы вучэбных кабінетаў, спартыўнай залы, групы падоўжанага дня, пункта карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, прывядзенню іх у адпаведнасць з патрабаваннямі функцыянальнай прыдатнасці, эстэтычнаму афармленню. Ва ўсіх вучэбных кабінетах праведзены касметычны рамонт. Заменены краны ў сталовай. У кабінеты біялогіі, фізікі, ГПД установлены жалюзі. Кабінет біялогіі абстаўлены новай мэбляю.

Сіламі педагогаў і тэхнічных работнікаў ажыццёўлены бягучы рамонт усіх школьных памяшканняў.

Праведзена пэўная работа па добраўпарадкаванні і азеляненні прышкольнай тэрыторыі:

- разбіты дэкаратыўныя клумбы;
- выраблены частковы рамонт і афарбоўка агароджы прышкольнай тэрыторыі.

Разам з тым актуальнай застаецца праблема забяспечанасці неабходным вучэбным абсталяваннем, а таксама выкарыстання наяўнага абсталявання ў навучальным працэсе. Патрабуецца замена шпалеры у кабінетах дэфектолага, педагога сацыяльнага, у пакоі для дзейнасці дзіцячых і маладзёжных арганізацый.

Такім чынам, па-ранейшаму нявырашанай застаецца праблема неадпаведнасці вучэбна-матэрыяльнай базы школы дзеючым нарматывам і сучасным патрабаванням, што не дазваляе ў поўнай меры задаволіць усе адукацыйныя запыты навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў.

**Задачы на 2024/2025 навучальны год:**

1.Працягваць работу па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы школы за кошт прыцягнення пазабюджэтных сродкаў і спонсарскай дапамогі.

2.Забяспечыць аптымальныя ўмовы для арганзацыі працы ГПД, правядзення ўрокаў тэхнічнай працы з улікам наяўных магчымасцяў у школе.

***VII.Вынікі***

Аналіз выканання пастаўленых на 2023/2024 навучальны год задач дазваляе зрабіць наступныя высновы: у цэлым сістэма работы педагагічнага калектыву,

накіраваная на павышэнне якасці адукацыі навучэнцаў, захавання і ўмацавання іх здароўя, досыць эфектыўная, пра што сведчаць яе вынікі. Аднак па розных прычынах нявырашаным застаецца шэраг праблем. У наступным навучальным годзе мэтазгодна працягнуць працу, накіраваную на павышэнне якасці адукацыі навучэнцаў, сканцэнтраваўшы асаблівую ўвагу педагагічнага калектыву на развіцці інфармацыйна-камунікатыўнага падыходу, удасканаленні прафесійнага майстэрства, забеспячэнні выніковасці навучальных заняткаў, факультатыўных заняткаў, стымулюючых і падтрымліваючых заняткаў, на стварэнне ў школе здароўезберагалючага асяроддзя, фарміраванні ў вучняў свядомага і адказнага стаўлення да пытанняў асабістай бяспекі і бяспекі навакольных.

***VIII. Заключэнне***

Выходзячы з аналіза работы педагагічнага калектыву на 2024/2025 навучальны год вызначаны **наступныя задачы:**

1. Павышэнне кампетэнтнасці педагагічнага калектыву праз:

- фарміраванне сістэмы работы па абагульненню перадавога педагагічнага вопыту;
- апрабацыю новых форм навучання ( напрыклад, інтэграваны ўрок з апорай на міжпрадметныя сувязі вучэбных прадметаў);
- расшырэнне сферы выкарыстання інфармацыйных тэхналогій.

Павышэнне якасці адукацыі на аснове:

- стварэння ўмоў для паспяховага навучання дзяцей з рознымі адукацыйнымі магчымасцямі, сродкамі выкарыстання элементаў новых адукацыйных тэхналогій;
- стварэнне ўмоў для выяўлення і развіцця інтэлектуальна адораных вучняў;
- узмацнення практычнай накіраванасці ўрокаў, факультатыўных, стымулюючых і падтрымліваючых заняткаў;
- павышэнне якасці адукацыі вучняў праз ажыццяўленне паглыбленай дыферэнцыяцыі навучання вучняў сродкамі сістэмнага падыходу да арганізацыі факультатыўных, стымулюючых, падтрымліваючых заняткаў;
- выкарыстанне здароўезберагаючых тэхналогій.

3. Фарміраванне ў вучняў высокамаральных ідэалаў праз:

- павышэнне эфектыўнасці узаемадзеяння установы адукацыі з бацькамі па пытаннях выхавання, прафілактыкі супрацьпраўных дзеянняў;
- узмацненне выхаваўчай ролі урока;
- развіццё школьнага самакіравання ў рамках дзіцячых і грамадскіх аб'яднанняў.

Рэалізацыя пастаўленых задач прадугледжвае:

- ажыцяўленне комплекса арганізацыйна-педагагічных мерапрыемстваў, накіраваных на стварэнне адаптыўнай адукацыйнай атмасферы, адпавядаючай развіццю індывідуальнасці вучняў;
- працяг пачатых і развіццё новых накірункаў работы з адоранымі вучнямі;
- развіццё сацыяльнай актыўнасці вучняў на аснове гуманізацыі адукацыйнага працэсу;

- забяспячэнне выканання Закана РБ “ АБ правх дзіцяці” у працэсе рэалізацыі комплексна-мэтавых праграм “ Падлетак і закон “, “Сям’я”;
- забяспячэнне прафесійнага роста настаўнікаў праз арганізацыю школьных метадычных аб’яднанняў і самаадукацыю настаўнікаў;
- стварэнне ўмоў для пасяховага навучання дзяцей з рознымі адукацыйнымі магчымасцямі сродкам рэалізацыі дыферэнцыраванага падыходу.

## <u>Праблема школы</u>

## “Удасканаленне сістэмы прафесійна-асобаснага росту педагогаў для забеспячэння эфектыўнасці адукацыйнага працэсу”

Мэта:

стварэнне ўмоў для ўдасканалення ўзроўня педагагічнага майстэрства настаўнікаў, іх прафесійнай кампетэнтнасці з мэтай забеспячэння эфектыўнасці адукацыйнага працэсу і павышэння якасці ведаў вучняў.

Задачы:

1. Спрыяць фарміраванню і развіццю прафесійных кампетэнцый і майстэрства педагагічных работнікаў праз забеспячэнне іх бесперапыннай адукацыі, уключэнне ў інавацыйную і праектную дзейнасць, актыўнае выкарыстанне сучасных інфармацыйных і адукацыйных тэхналогій, якаснае метадычнае суправаджэнне і эфектыўнае ўзаемадзеянне ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу.

2.Фарміраваць здароўезберагаючае асяроддзе і забяспечыць бяспечныя ўмовы для навучання і выхавання дзяцей ва ўстанове адукацыі.

3.Забяспечыць фарміраванне адукацыйных кампетэнцый навучэнцаў, якасць адукацыі і выніковасць работы з талантлівымі дзецьмі праз павышэнне якасці прадстаўляемых паслуг, актыўнае ўключэнне вучняў ў навукова – практычную дзейнасць і алімпмядны рух.

4.Садзейнічаць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці, цэннасных арыентацый і маральных якасцей асобы, самавызначэння, самарэализацыі і пасяховай сацыялізацыі ў сучасным грамадстае праз укараненне разнастайных форм выхаваўчай работы, арганізацыю вольнага часу і занятасці навучэнцаў, арганізацыйна – метадычную падтрымку дзіцячых і маладзёжных грамадскіх арганізацый, узаемадзеянне з бацькамі, усімі зацікаўленымі структурамі і грамадскасцю.

5.Павышаць эфектыўнасць работы па ранняму выяўленню сямейнага недабрабыту і прафілактыцы асацыяльных паводзін сярод непаўналетніх праз удасканаленне сістэмы аказання сацыяльна – псіхалагічнай і педагагічнай дапамогі навучэнцам і іх бацькам.

6.Садзейнічаць укараненню і развіццю інклюзіўнай адукацыі, сацыялізацыі і адукацыйнай інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і дзяцей – інвалідаў.

7.Прадоўжыць работу па ўкараненню матэрыяльна – тэхнічнай і вучэбна – метадычнай базы школы, інфарматызацыі адукацыйнага працэсу, стварэнню

адзінага інфармацыйнага асяроддзя ва ўстанове адукацыі за кошт прыцягнення і эфектыўнага выкарыстання розных крыніц фінансавання.

Чакаемыя вынікі:

- стварэнне ўмоў для захавання і прымнажэння інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу як педагогаў, так і навучэнцаў;

-павышэнне якасці педагагічнага майстэрства настаўнікаў-прадметнікаў;

- павышэнне якасці адукацыі і выхавання навучэнцаў;

- павышэнне рэзультатыўнасці ўдзелу вучняў ў рэспубліканскай і абласной алімпіядах, інтэлектуальных і творчых конкурсах, навукова-даследчай працы.

**2. Працэс кіравання установай адукацыі.**
**2.1. Планаванне, арганізацыя дзейнасці ўстановы адукацыі**

| Месяц | Пасяджэнні педагагічных саветаў | Нарады пры адміністрацыі | Пасяджэнні апякунскага савета, бацькоўскага камітэту |
|---|---|---|---|
| Жнівень | | 1.Гатоўнасць школы да новага навучальнага года (санітарна-гігіенічны рэжым і тэхніка бяспекі, ступень гатоўнасці вучэбных кабінетаў, сталовай, спартзалы).<br>Адказны Раманава Н.І.<br>2.Арганізацыя выхаваўча-прафілактычнай работы з вучнямі асацыяльных паводзін у летні перыяд.<br>Адказны Баравая В.М.<br>3.Вынікі размеркавання выпускнікоў 9-га і 11-х класаў па каналах далейшага навучання і працаўладкавання.<br>Адказны Баравая В.М.<br>4. Аб размеркаванні педагагічнай нагрузкі педагагічных работнікаў на 2024/2025 навучальны год<br>Адказны Раманава Н.І.<br>5.Фарміраванне ГПД, спартыўных секцый, аб'яднанняў па інтарэсах, арганізацыя работы факультатыўных заняткаў<br>Адказны Баравая В.М.<br>6.Своечасовасць, правільнасць афармлення вядзення асабовых спраў вучняў | 1. Аб узгадненні рэжыму групы падоўжанага дня<br>Адказны Баравая В.М. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | Адказны Раманава Н.І.<br>7.Санітарны стан спартыўнай залы, санвузлоў, іх адпаведнасць прабаванням СанПін.<br>Адказны Раманава Н.І.<br>8.Работа МА па вывучэнню ІМП Міністэрства адукацыі і другіх нарматыўных прававых дакументаў.<br>Адказны Баравая В.М. | |
| Верасень | | 1.Аб правядзенні Дня ведаў і першага ўрока.<br>Адказны Баравая В.М.<br>2.Арганізаваны пачатак навучальнага года. Стан вядзення дакументацыі.<br>Адказны Баравая В.М.<br>3.Вынікі летняй аздараўленчай кампаніі.<br>Адказны Баравая В.М.<br>4.Арганізацыя работы настаўніцка – бацькоўскіх патрулей у ЦКіД, школе.<br>Адказны Баравая В.М.<br>5.Захаванне санітарна-гігіенічных нормаў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу<br>Адказны Раманава Н.І.<br>6.Аб адзенні дзелавога стылю.<br>Адказны Баравая В.М.<br>7.Работа педкалектыву па ўліку дзяцей і падлеткаў, якія належаць навучанню на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі.<br>Адказны Баравая В.М.<br>8.Забяспечанасць вучняў падручнікамі. | 1.Вынікі дзейнасці школы за 2023/2024 навучальны год. Гатоўнасць школы да новага навучальнага года.<br>2.Вынікі фінансавай дзейнасці апякунскага савету за 2023/2024 навучальны год.Справаздача аб рамонтных работах у летні перыяд 2024 года.<br>Адказны Верасовіч Т.В.<br>3. Выбары апякунскага савету. Зацвярджэнне плана работы на 2024/2025 нав. год.<br>Адказны Раманава Н.І. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | Адказны Баравая В.М.<br>9.Арганізацыя гарачай ежы для навучэнцаў.<br>Адказны Баравая В.М.<br>10.Аналіз работы педагагічнага калектыву па ахове дзяцінства праз рэалізацыю Дэкрэту №18.<br>Адказны Баравая В.М.<br>12.Праверка планаў работы на год, своечасовасць і правільнасць вядзення дакументацыі кіраўнікамі МА.<br>Адказны Баравая В.М.<br>13.Арганізацыя работы аб'яднанняў па інтарэсах, факультатыўных заняткаў на платнай аснове.<br>Адказны Раманава Н.І.<br>14. Прафілактыка дзіцячага траўматызму<br>Адказны Баравая В.М. | |
| Кастрычнік | Арганізацыя дзейнасці педагагічнага калектыву па прафілактыцы правапарушэнняў і злачынстваў сярод непаўналетніх<br>Адказны Баравая В.М.<br>Стан выкладання і якасць ведаў вучняў па вучэбным прадмеце "Матэматыка"<br>Адказны Баравая В.М. | 1.Арганізацыя і правядзенне атэстацыі педагагічных работнікаў<br>Адказны Баравая В.М.<br>2.Арганізаванае заканчэнне І вучэбнай чвэрці<br>Адказны Баравая В.М.<br>3.Працэс адаптацыі вучняў 1-га , 5-га класаў.<br>Адказны Баравая В.М.<br>4.Аб правядзенні першага этапа дыягнастычнага тэсціравання<br>Адказны Баравая В.М.<br>5.Аб выніках правядзення першага этапа рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | прадметах і аб арганізацыйных мерах па ўдзеле ў другім этапе рэспубліканскай алімпіяды.<br>Адказны Баравая В.М.<br>7.Аб стане класных журналаў, журналаў аб'яднанняў па інтарэсах<br>Адказны Баравая В.М. | |
| Лістапад | | 1.Выніковасць дзейнасці педагагічнага калектыву па стварэнню ўмоў для занятасці вучняў у шосты школьны дзень<br>Адказны Баравая В.М.<br>2.Стан класных журналаў<br>Адказны Баравая В.М.<br>3.Аб наведванні вучэбных заняткаў вучнямі<br>Адказны Баравая В.М.<br>4.Работа па прафілактыцы правапарушэнняў і злачыннасці сярод вучняў школы.<br>Адказны Баравая В.М.<br>5.Работа классных кіраўнікоў па выхаванню ў навучэнцаў культуры харчавання.<br>Адказны Баравая В.М.<br>6.Работа педагога сацыяльнага, класных кіраўнікоў па выкананні Дэкрэта Прэзідэнта №18 ад 24 лістапада 2006 года.<br>Адказны Баравая В.М.<br>7.Стварэнне здароўезберагальных умоў пры ажыццяўленні адукацыйнага працэсу.<br>Адказны Баравая В.М. | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | 8.Папярэджанне перагрузкі вучняў. Дазаванне дамашняга задання.<br>Адказны Баравая В.М. | |
| Снежань | | 1.Аб выніках удзелу ў другім этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах<br>Адказны Баравая В.М.<br>2.Аб выніках ўдзелу ў першым этапе рэпетыцыйнага тэсціравання.<br>Адказны Баравая В.М.<br>3.Арганізаванае заканчэнне II вучэбнай чвэрці<br>Адказны Баравая В.М.<br>4.Арганізацыя работы падтрымліваючых заняткаў з навучэнцамі нізкага ўзроўню вучэбнай матывацыі<br>Адказны Баравая В.М.<br>5.Стан работы па прафілактыцы Сніду, алкагалізму, тытунекурэня, наркаманіі.<br>Адказны Баравая В.М.<br>6.Арганізацыя зімовых канікулаў.<br>Адказны Баравая В.М.<br>7.Арганізацыя работы па самападрыхтоўцы ў ГПД<br>Адказны Баравая В.М.<br>8.Стан вядзення класных журналаў<br>Адказны Баравая В.М. | 1. Арганізацыя і ажыццяўленне кантролю за якасцю гарачага харчавання вучняў.<br>Адказны Раманава Н.І.<br>2.Арганізацыя і правядзенне мерапрыемстваў па прафілактыцы шкодных звычак.<br>Адказны Баравая В.М. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | 9.Стан работы кіраўніка па ваенна-патрыятычнаму выхаванню за I паўгоддзе 2024/2025 навучальнага года.<br>Адказны Баравая В.М. | |
| Студзень | 1.Сучасны вучэбны занятак у кантэксце фарміравання функцыянальнай граматнасці навучэнцаў<br>Адказная Баравая В.М.<br>2.Стан выкладання і якасць ведаў вучняў па вучэбнаму прадмету “Інфарматыка”.<br>Адказны Баравая В.М. | 1.Аналіз работы па прафілактыцы злачынстваў і правапарушэнняў за 1 паўгоддзе 2024/2025 навучальнага года.<br>Адказны Баравая В.М.<br>2.Вынікі работы бацькоўска – настаўніцкага патруля.<br>Адказны Баравая В.М.<br>3.Аналіз работы па выяўленню вучняў, якія знаходзяцца ў сацыяльна – небяспечным становішчы, вучняў, якія патрабуюць павышанай педагагічнай увагі.<br>Адказны Баравая В.М.<br>4.Аб стане школьнай дакументацыі.<br>Адказны Баравая В.М.<br>5.Аб вядзенні дакументацыі школьных метадычных аб'яднанняў.<br>Адказны Баравая В.М.<br>6.Стан спартыўнай і фізкультурна – аздараўленчай работы у школе. Выніковасць удзелу ў спаборніцтвах.<br>Адказны Баравая В.М.<br>7.Аб стане работы аб’яднанняў па інтарэсах<br>Адказны Баравая В.М. | 1. Вызначэнне напрамкаў, размераў і парадку выкарыстання сродкаў апякунскага савету на 2024/2025 навучальны год.<br>Адказны Раманава Н.І.<br>2.Аналіз работы па прадухіленню траўматызму і стварэнню бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу.<br>Адказны Раманава Н.І. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | 8.Эфектыўнасць работы праекта “Прававая асвета”<br>Адказны Баравая В.М. | |
| Люты | | 1.Захаванне СНіП пры ажыццяўленні адукацыйнага працэсу<br>Адказны Баравая В.М.<br>2.Індывідуальная работа настаўнікаў-прадметнікаў з вучнямі з АПФР<br>у інтэграваных класах<br>Адказны Баравая В.М.<br>3.Аб стане фізкультурна – масавай работы ў школе.Работа секцый.Дзень здароўя.<br>Адказны Баравая В.М.<br>4.Прафілактыка і папярэджанне дзіцячага траўматызму<br>Адказны Баравая В.М.<br>5.Аб эфектыўнасці правядзення стымулюючых і падтрымліваючых заняткаў<br>Адказны Баравая В.М.<br>6. Класна -абагульняючы кантроль вучняў 9 класа<br>Адказны Баравая В.М.<br>7. Эфектыўнасць работы праекта “Бацькоўскі універсітэт”<br>Адказны Баравая В.М. | |
| Сакавік | 1.Выхаванне патрыятызму і грамадзянскасці як | 1 .Аб падрыхтоўцы да абласной алімпіяды<br>Адказны Баравая В.М. | 1.Планаванне рамонтных работ па падрыхтоўцы школы да новага навучальнага года. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | стратэгічныя арыетціры ідэалогіі сучаснага грамадства Адказны Баравая В.М.<br>2.Стан выкладання і якасць ведаў вучняў па вучэбных прадметах “Геаграфія” Адказны Баравая В.М. | 2.Стан школьнай дакументацыі (класныя журналы, сшыткі, дзённікі вучняў)<br>Адказны Баравая В.М.<br>3.Арганізаванае заканчэнне ІІІ вучэбнай чвэрці<br>Адказны Баравая В.М.<br>4.Работа з вучнямі, якія знаходзяцца на ўсіх відах кантроля.<br>Адказны Баравая В.М.<br>6.Эфектыўнасць работы аб’яднанняў па інтарэсах<br>Адказны Баравая В.М.<br>7.Арганізацыя работы па прафілактыцы негатыўных з’яў у падлеткавым асяроддзі<br>Адказны Баравая В.М. | Адказны Раманава Н.І.<br>2.Навядзенне парадку на прышкольнай тэрыторыі.<br>Адказны Раманава Н.І. |
| Красавік | | 1.Аб стане работы пункта карэкцыйна-педагагічнай дапамогі<br>Адказны Баравая В.М.<br>2.Аб выніках работы настаўнікаў з высокаматываванымі вучнямі па выніках прадметных алімпіяд і навукова-даследчай дзейнасці<br>Адказны Баравая В.М.<br>3.Арганізацыя паўтарэння вучэбнага матэрыялу, падрыхтоўка вучняў 9, 11 класаў да выніковай атэстацыі, цэнтралізаванага экзамену<br>Адказны Баравая В.М. | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | 4.Прафарыентацыйная работа класных кіраўнікоў.<br>Адказны Баравая В.М.<br>6.Стан вядзення класных журналаў<br>Адказны Баравая В.М.<br>7.Аб арганізацыі работы па падрыхтоўцы вучняў 11 класа да цэнтралізаванага экзамену<br>Адказны Баравая В.М.<br>8.Арганізацыя і правядзенне свят, прысвечаных Дню Перамогі<br>Адказны Баравая В.М. | |
| Май | 1.Аб пераводзе вучняў I-VIII, X класаў.<br>2. Аб допуску вучняў IX, XI класаў да выпускных экзаменаў па завяршэнні навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі. | 1.Аб рабоце метадычных аб'яднанняў<br>Адказны Баравая В.М.<br>2.Аб узроўню ведаў вучняў 1-га - 5-га класаў<br>Адказны Баравая В.М.<br>3.Арганізаванае заканчэнне вучэбнага года.<br>Адказны Баравая В.М.<br>4.Вынікі дзейнасці ўстановы за 2024/2025 навучальны год<br>Адказны Баравая В.М.<br>5.Эфектыўнасць правядзення факультатыўных заняткаў<br>Адказны Баравая В.М.<br>6.Аб стане школьнай дакументацыі<br>Адказны Баравая В.М.<br>7.Арганізацыя работы па падрыхтоўцы вучняў 9 класа да выпускных экзаменаў<br>Адказны Баравая В.М. | 1.Арганізацыя летняга аздараўлення і занятасці ў час летніх канікулаў.<br>Працаўладкаванне вучняў.<br>Адказны Баравая В.М.<br>2.Справаздача аб выкарыстанні дабрачынных сродкаў.<br>Адказны Раманава Н.І. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | 8.Вынікі дзейнасці кіраўніка па ваенна-патрыятычнаму выхаванню за 2024/2025 навучальны год<br>Адказны Баравая В.М. | |
